# БУДЗЕМ У 16-ці ЛЕПШЫХ ЦІ НЕ?

**БЕЛАРУСКІЯ гандбольныя клубы, мінскія «Дынама» і СКА, правялі першыя матчы 1/16 фіналу ў другім па значнасці еўракубку — Кубку ЕГФ (Еўрапейскай гандбольнай федэрацыі). СКА ўдзельнічае ў турніры з першага раўнда, і паспеў прайсці з невялікай перавагай эстонскую «Пыльву» ды кіпрскі «Страволас». «Бела-блакітныя» ж, як першы клуб краіны, распачыналі еўракубкавы сезон з Лігі чэмпіёнаў, але прайсці там далей не атрымалася. Вымушаны «спуск» у Кубак ЕГФ на пачатку прынёс станоўчыя эмоцыі: турэцкі «Мілі Піянга» наўрад ці адпавядаў па сіле нават фарм-клубу дынамаўцаў і быў разгромлены ўшчэнт.**

У 1/16 фіналу абодвум беларускім клубам дасталіся супернікі з Францыі: армейцам патрапіўся «Істр», дынамаўцам «Дзюнкерк». У сёлетнім чэмпіянаце сваёй краіны, у якім каманды правялі па восем гульняў, «Істр» знаходзіцца ў сярэдзіне табліцы, а вось «Дзюнкерк» замыкае тройку лідараў. Паводле каментараў спецыялістаў, апаненты праходныя, так што нашы клубы небеспадстаўна спадзяюцца на працяг барацьбы. СКА распачынаў у гасцях, гульня аказалася няпростай, і каманда Спартака Мірановіча саступіла 25:32. мінус 7 — гэта нямала, аднак усё адно, лёс армейцаў вырашыцца ў паядынку ў адказ, які адбудзецца 22 лістапада ўжо ў Мінску.



Фота БЕЛТА.

Матч «Дынама» — «Дзюнкерк»: у атацы Барыс Пухоўскі.

Перамена месца гульні, натуральна, была для «бела-блакітных» часовай з'явай, бо тут плануецца праводзіць толькі міжнародныя матчы, да таго ж у холе падчас гульні з «Дзюнкеркам» стаяў Кубак чэмпіёнаў, які заваяваў Сяргей Рутэнка з іспанскім «Сьюдад-Рэалем». Прычым зрабіў гэта тройчы: у 2006, 2008 і 2009 гадах. Сёлета Сяргей перайшоў у каманду лютага ворага «Сьюдада» — «Барселону», але ўсё выйшла досыць дыпламатычна: прадстаўнікі «Сьюдад-Рэаля» на прэзентацыі трафея нечакана паабяцалі зрабіць для мінскага «Дынама» копію трафея. Дэбют матча прайшоў няспешна, дынамаўцы пастаянна вялі ў ліку, аднак розніцу істотна павялічыць не маглі. У рэшце рэшт дзве запар няўдачы каля чужых варотаў у беларусаў і дакладны кідок ісландца Оскарсана дапамаглі «львам», якія ў 2004 годзе дабіраліся да фіналу Кубка выкліку, зраўняць лік. І тым не менш, намаганні «бела-блакітных», а дакладней Дзяніса Рутэнкі, Віталя Кажанеўскага і Антона Рубізава дазволілі да 18-й хвіліны адарвацца ад французаў на тры мячы — 10:7, і няхай на 23-й хвіліне Туаці скараціў розніцу да аднаго мяча, на перапынак каманды сышлі пры перавазе беларусаў +3. Не абышлося ў першай палове без непрыемнасцяў для гаспадароў: паўсярэдні Марэціч атрымаў трэцяе выдаленне на дзве хвіліны, што значыла выдаленне да канца гульні. Праўда, гэта не перашкодзіла дынамаўцам на старце другога тайма закінуць тры мячы запар: Рутэнка і Пухоўскі, які забіў двойчы, увялі «Дынама» ў адрыў 18:12. Але ад 41-й да 48-й хвіліны настала «паўза» на працягу якой беларусы не закінулі ніводнага мяча. Толькі надзейная гульня Рапаўца не дазволіла «Дзюнкерку» наблізіцца, за гэты час толькі няўрымслівы Оскарсан рэалізаваў сяміметровы ды двойчы вызначыўся Туаці. Пасля гэтага гаспадары спакойна давялі матч да перамогі 29:24. Самым прадуктыўным у нашай камандзе аказаўся Барыс Пухоўскі, ён закінуў 6 мячоў. Цяпер дынамаўцы згуляюць у гасцях, гульня пройдзе 22 лістапада, у гэты ж дзень згуляе і СКА.

На адзін дзень раней правядзе свой паядынак у адказ на стадыі 1/16 фіналу Кубка кубкаў Брэсцкі ГК імя Мяшкова, што прайграў у гасцях дацкаму «Хольстэбра» 23:31.

**Арцём СІЗІНЦАЎ.**

# ПРЫДАРОЖНЫ СЭРВІС МОЖА І ПАВІНЕН БЫЦЬ ПРЫБЫТКОВЫМ

**УГЭТЫМ перакананы прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, які ўчора быў у рабочай паездцы на Гродзеншчыне.**

У Іўеўскім раёне, ля аўтадарогі Мінск — Гродна размешчаны дзве кавярні. «На скрыжаванні» ўваходзіць у структуру райспажыўтаварыства, сярэднямесячны тавараразварот сёлета за дзесяць месяцаў склаў каля 54 мільёнаў рублёў, у тым ліку 40 мільёнаў — па ўласнай прадукцыі. Спецыялізуецца на стравах беларускай кухні, прымаюцца папярэднія замовы, у тым ліку ад кіраўнікоў турыстычных групаў. Ёсць таксама два пакоі для адпачынку, прыняцця душу. Ёсць ужо пастаянныя кліенты і ў размешчанай побач кавярні «Масткі», якая належыць прыватнаму аўтатранспартнаму прадпрыемству. Прычым для іх паслугаў не толькі смачныя стравы, але і пяць гасцінічных нумароў.

Увогуле на рэспубліканскіх аўтадарогах сёння працуе шмат аб'ектаў прыдарожнага і дарожнага сэрвісу (толькі на Гродзеншчыне іх 180), аднак такіх сучасных пакуль няшмат. Праграма развіцця гэтай сферы ў краіне ёсць, аднак, падкрэсліў Сяргей Сідорскі, пра яе слаба ведаюць патэнцыяльныя інвестары. Канкрэтныя даручэнні ў гэтай сувязі дадзены адпаведным рэспубліканскім і абласным органам.

Кіраўнік ўрада таксама наведаў жывёлагадоўчы комплекс сельгаспрадпрыемства «Ніва» Лідскага раёна, дзе, у прыватнасці, абмяркоўвалася пытанне аб уключэнні ў энергетычны патэнцыял біягазавых установак, каб падаграваць ваду і выпрацоўваць электраэнергію. Гэта цалкам рэальна, паколькі ёсць прапановы інвестараў. А ў ААТ «Лакафарба» прэм'ер-міністр цікавіўся аховай працы, паляпшэннем умоў працы і быту работнікаў. На прадпрыемстве пабудавалі сучасныя, унікальныя для лакафарбавых вытворчасцяў на ўсёй постсавецкай прасторы ачышчальныя збудаванні. У выніку плюс і па экалогіі, і па выкарыстанні адходаў.

Некалькі пазней, адкрываючы ў Лідзе нараду па правядзенні сёлета Года роднай зямлі, Сяргей Сідорскі адзначыў, што такія праекты, як у ААТ «Лакафарба», павінны «тыражавацца» і ў іншых галінах эканомікі: «Трэба па-новаму зірнуць на ўсе гэтыя тэхналогіі, стварыць магутную інвестыцыйную праграму па перапрацоўцы тэхналагічных адходаў».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ ВЫНЕСЛА ПАПЯРЭДЖАННІ ЧАТЫРОМ ГАЗЕТАМ

**МІНІСТЭРСТВА інфармацыі Беларусі вынесла пісьмовыя папярэджанні чатыром газетам, паведамляецца на афіцыйным сайце Мініифарма.**

Папярэджанні вынесены газетам «Комсомольская правда» в Белоруссии», «Наша ніва», «Народная воля» і «Ва-банкъ» «у сувязі з парушэннямі ў публікацыях патрабаванняў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі».

Пісьмовае папярэджанне вынесена 16 лістапада 2009 года заснавальніку газеты «Ва-банкъ» і юрыдычнай асобе, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі газеты, аб недапушчальнасці парушэння арт.14 (перарэгістрацыя СМІ), арт. 38 (інфармацыя, распаўсюджванне якой у сродках масавай інфармацыі забаронена) і арт. 49 (пісьмовае папярэджанне) вышэйназванага закона.

У той жа дзень вынесена пісьмовае папярэджанне юрыдычнай асобе, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі газеты «Наша ніва», аб недапушчальнасці парушэння арт. 34 (статус журналіста сродка масавай інфармацыі) закона.

Акрамя таго, 17 лістапада 2009 года вынесена пісьмовае папярэджанне юрыдычнай асобе, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі газеты «Народная воля», аб недапушчальнасці парушэння арт. 38 (інфармацыя, распаўсюджванне якой у сродках масавай інфармацыі забаронена) закона, а таксама юрыдычнай асобе, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі газеты «Комсомольская правда» в Белоруссии», аб недапушчальнасці парушэння арт. 4 (асноўныя прынцыпы дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі) і арт. 49 (пісьмовае папярэджанне) закона Беларусі «Аб сродках масавай інфармацыі».

«У папярэджаннях прадпісана ліквідаваць у дзесяцідзённы тэрмін парушэнні закона, аб чым ва ўстаноўленым парадку паведаміць Міністэрству інфармацыі», — адзначаецца ў паведамленні Мініифарма.

**Кар. БЕЛТА.**

## Абзац

◢ Мінскі мясакамбінат да 2015 года будзе вынесены за межы горада, адзначалася ўчора на прэс-канферэнцыі ў Мінгарвыканкаме. Сёння гэтая вытворчасць не адпавядае экалагічным патрабаванням. З улікам таго, што ў перспектыве ў гэтым раёне будзе размешчаны комплекс «Мінск-сіці», намечаны вынас камбіната. Размясціць мясакамбінат плануецца на плошчах ААТ «Гастэлаўскае» ў Мінскім раёне.

**◢ Мінчанка спрабавала двойчы абрабаваць адну і тую ж абутковую краму. Спачатку 22-гадовая дзяўчына непрыкметна, нават нягледзячы на спецыяльныя датчыкі, усталяваныя на выхадзе, вынесла сем пар абутку больш чым на 2 млн бел. руб. Выкрадзенае яна на наступны дзень раніцай панесла прадаваць на рынак. Вечарам таго ж дня дзяўчына зноў наведалася ў тую ж краму. Аднак на гэты раз персанал быў падрыхтаваным: пад выглядам звычайных пакупнікоў прадаўцы хадзілі па памяшканні і выглядалі падазроных асобаў. Калі мінчанка паспрабавала вынесці тры пары абутку на суму 0,5 млн бел. рублёў, яе затрымалі і перадалі супрацоўнікам міліцыі.**

◢ Гродзенская студэнтка за адну ноч учыніла два злачынствы. 19-гадовая дзяўчына, якая прыехала да бацькоў у Слонім, разам з сяброўкай адправілася адпачыць у більярдны клуб. Там яна прыхапіла пакінуты без нагляду чужы кашалёк з Br350 тыс. і двума банкаўскімі карткамі. У партманеце знайшлася і паперка з пін-кодам адной з картак, і студэнтка адразу ж зняла Br3 млн у банкамаце. Супрацоўнікам Слонімскага РАУС удалося хутка выйсці на след падазронай. Ужо раніцай наступнага дня яна давала паказанні. Распачатыя 2 крымінальныя справы — за крадзеж і крадзеж шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі.

**◢ Паведамленне аб выбуху бытавога газу ў кватэры на восьмым паверсе 9-павярховага дома ў Гомелі паступіла ў аператыўны цэнтр кіравання МНС увечары. Успышка газа-паветранай сумесі адбылася ў той момант, калі гаспадар кватэры, 1959 года нараджэння, спрабаваў запаліць патухлую газавую пліту. У выніку ён атрымаў апёкі першай і другой ступені 45 % цела і быў шпіталізаваны. З жыхароў больш ніхто не пацярпеў. Выбуховай хваляй таксама было пашкоджана шкло балконных дзвярэй, абрушылася балконная рама, якая ўпала на аўтамабілі, што стаялі ўнізе, часткова пашкодзіўшы іх.**

◢ У Аршанскім раёне на аўтадарозе Брэст — Мінск — мяжа Расійскай Федэрацыі міліцыянеры з ДАІ затрымалі аўтамабіль «Івека», што належыць сталічнаму індывідуальнаму прадпрымальніку. На аўто правозіліся больш за 2800 літраў вадкасці «Шторм» на аснове спірту. Кошт грузу — 6 мільёнаў 555 тысяч рублёў. Дакументы, якія маглі б пацвердзіць якасць тавару і легальнасць яго набыцця, адсутнічалі. Склалі адміністрацыйны пратакол. Вадкасць канфіскавалі.

## Поўны абзац

**◢ У Дзень цвярозасці ў Гродне затрымалі ўдвая большую колькасць п'яных кіроўцаў, паведаміла газета «Вечерний Гродно». Чарговы Дзень цвярозасці ў Гродне прайшоў у мінулую пятніцу, 13 лістапада. Па звестках ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама, за папярэдні дзень (12 лістапада) было затрымана ў два разы менш нецвярозых аўтааматараў.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# З-за чаго знакаміты беларускі ксёндз трапіў у рэанімацыю?

**УСВЯТАРА Юзаса Булькі, зацятага змагара з алкагалізмам і адраджэнца беларускай культуры, здарыўся інфаркт. Жыхары вёскі Мосар, дзе жыве 83-гадовы ксёндз, упэўненыя, што іх духоўнага настаўніка давялі да такога стану «паклёпніцкія артыкулы» ў газетах.**

Ксёндз Юзас Булька заўсёды вылучаўся моцным здароўем і крэатыўным розумам. Сур'ёзныя праблемы ў святара пачаліся ў сакавіку гэтага года, калі ён трапіў у бальніцу горада Глыбокае: меў праблемы з ціскам.

На мінулым тыдні айцец Юзас зноўку трапіў у бальніцу. Дыягназ страшны — «ачаговы інфаркт». Урачы рабілі ўсё магчымае, але не абяцалі, што 83-гадовы ксёндз справіцца. Але праз некалькі дзён, дзякуй Богу, цяжкі стан здароўя святара палепшыўся.

*— А ў суботу яго даставілі ў 4-ю клінічную бальніцу Мінска, у кардыялагічнае аддзяленне,* — паведаміў «Звяздзе» **загадчык аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі Глыбокскай райбальніцы Леанід ВАСІЛЁНАК.**

Як стала вядома «Звяздзе», ксёндз паступова ідзе на папраўку, а ў мосарскім касцёле Святой Ганны за яго ў гэты час моляцца аднадумцы.

*— Яму даўно прапаноўвалі легчы ў бальніцу, усё ж чалавеку 83 гады, часта падымаўся ціск,* — жаліцца карэспандэнту «Звязды» **Марыя Ткачонак,** загадчыца мясцовага краязнаўчага музея, створанага па ініцыятыве ксяндза. — *А ён усё адмаўляўся, маўляў, на могілках парадак трэба навесці, ля касцёла папрацаваць, пакуль маразы не прыйшлі. Надвор'е стаяла дрэннае, ксяндзу пагоршала, пачаў ён ездзіць у глыбоцкую бальніцу, на кропельніцы. А там яму зрабілася яшчэ горай, паклалі ў рэанімацыю. А здароўе пачало пагаршацца, калі на ксяндза пачалі выходзіць «паклёпы» ў газетах...*

Спадарыня Марыя адвяла карэспандэнта «Звязды» ў касцёл Святой Ганны да наглядчыцы храма бабулі Станіславы Наско.

*— Ксёндз нам нічога не гаварыў, многае насіў у сабе,* — расказвае пра перажыванні ксяндза ***Станіслава НАСКО.*** — *Траўля на яго вось калі пачалася. Некалькі гадоў таму да яго прыехаў адзін мясцовы актывіст, хацеў стаць дэпутатам. Мы з ксяндзом якраз на лаўцы сядзелі. Той актывіст пытаецца: «Ці можаце за мяне агітаваць?» А ксёндз яму: «Каб быць дэпутатам, трэба не агітаваць, а заслужыць гэта ў людзей!» Развярнуўся і пайшоў. Праз нейкі час па Мосары сталі раскідаць газеты, распаўсюджваць чуткі, што ксёндз нейкі агент і людзей забіваў...*

Пракуратура Літвы сапраўды заяўляла пра завядзенне крымінальнай справы ў дачыненні да Юзаса Булькі. Яго падазравалі ў ваенных злачынствах супраць «лясных братоў», што пасля Другой сусветнай вайны змагаліся з камуністамі. У газетах друкаваўся групавы фотаздымак, на якім нібыта малады Булька стаяў у вайсковай форме літоўскіх антыкамуністаў. Па версіі пракуратуры, сваіх паплечнікаў, «лясных братоў», ён жа і здаваў савецкім спецслужбам.

Многія, не разабраўшыся, паверылі ў такую версію. Усё ж інфармацыю распаўсюдзіў не хто-небудзь, а сама пракуратура. Ды і ксёндз шмат гадоў таму прыехаў у Беларусь з Літвы.

> **Але расстроіўся ксёндз вельмі моцна. Вядома, такі паклёп на чалавека налажылі! Сказаў: «Калі мяне лічыце вінаватым, вазьму крыж на плечы і пайду выкупляць сваю віну.**

Але ў красавіку мінулага года пракурор Ігналінскага раёна Літвы Вальдэмарас Баранаўскас у размове з карэспандэнтам «Звязды» не прывёў аргументаў віны Юзаса Булькі. Больш за тое, высветлілася, што на тым самым фотаздымку ў форме «лясных братоў» стаяў зусім не Булька. Выходзіць, ніякіх доказаў няма, усе абвінавачванні — пусты гук.

*— Але расстроіўся ксёндз вельмі моцна. Вядома, такі паклёп на чалавека налажылі!* — працягвае расказваць са слязьмі на вачах Станіслава Наско. — *Сказаў: «Калі мяне лічыце вінаватым, вазьму крыж на плечы і пайду выкупляць сваю віну». Але за яго многія заступіліся, не паверылі ў гэту хлусню. Нездарма і ксёндз кажа, што дужа добрыя беларусы...*

Вельмі спадзяёмся, што ксёндз Юзас цалкам паправіцца і зможа працягваць рабіць добрыя справы на карысць духоўнага адраджэння беларусаў. А расстройваць святара малаабгрунтаванымі абвінавачваннямі больш ніхто не будзе.

У снежні ксяндзу Юзасу споўніцца 84 гады.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

## ПРАДАЎ УЛАСНУЮ КВАТЭРУ, КАБ АДНАВІЦЬ БЕЛАРУСКІ КАСЦЁЛ

Заслугі ксяндза Юзаса Булькі перад Беларуссю неапісальныя. Гэта ён аднавіў касцёл Святой Ганны ў вёсцы Мосар, а ля храма так прыгожа аздобіў тэрыторыю газонам, валунамі і экзатычнымі раслінамі, што замежныя ландшафтныя дызайнеры рты раскрываюць. На якія грошы?

Айцец Юзас прадаў уласную кватэру ў Вільні, усе сродкі яшчэ дваццаць гадоў таму пайшлі на аднаўленне мосарскай святыні. Аднавіў ксёндз касцёл і ў вёсцы Парыж Пастаўскага раёна, адрамантаваў храмы ў Варапаеве і Шаркоўшчыне.

У Мосары па ініцыятыве ксяндза паўстала алея цвярозасці, з'явіўся ўнікальны для Беларусі антыалкагольны музей. А таксама гара з крыжамі, помнік Папу Рымскаму Яну Паўлу Другому. У вёсцы Парыж усталявалі 30-метровую копію Эйфелевай вежы. Усе заслугі ксяндза цяжка пералічыць.

Дзякуючы ксяндзу з прыходам цёплага надвор'я ў рэгіён цягнуцца вераніцы турыстычных аўтобусаў. Праводзіць ксёндз Юзас сустрэчы і з прадстаўнікамі праваахоўных органаў. Выстраіўшы перад сабой міліцыянераў, ён як камандзір вучыць людзей у пагонах быць справядлівымі і не чыніць карупцыі. А больш зацятага змагара з алкагалізмам у Беларусі не знайсці. Вёска Мосар — адзіны населены пункт у Беларусі, дзе да канца гэтага года забаронена прадаваць алкаголь у крамах.

# Сербы называлі яго жывым святым

## Дэлегацыю Рускай Праваслаўнай Царквы на пахаванні Свяцейшага Патрыярха Сербскага Паўла ўзначаліць Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт

Пахаванне Прадстаяцеля Сербскай Праваслаўнай Царквы адбудзецца ў чацвер, 19 лістапада. Цела Патрыярха Паўла, які спачыў раніцай у нядзелю, 15 лістапада, пасля прыняцця Святых Хрыстовых Тайнаў, некалькі дзён знаходзілася ў саборным храме Святога Архангела Міхаіла ў Бялградзе, дзе штодня адбывалася заўпакойная Літургія і чытанне Евангелля над труной спачылага. Храм усе гэтыя дні быў адчынены для развітання з Прадстаяцелям.



Свяцейшы Патрыярх Павел узначальваў Сербскую Праваслаўную царкву з 1990 года. Ён спачыў на 96-м годзе жыцця. Беларусы маюць магчымасць больш даведацца пра гэтага незвычайнага чалавека праз яго кнігу «Уясним некоторые вопросы нашей веры. Ответы на вопросы о жизни современного человека в Церкви», якая была выдадзена на рускай мове ў Мінску ў 2007 годзе.

— Яго Свяцейшаства — гэта асоба, якую цяжка параўноўваць з кімсьці сярод жывых, — расказаў «Звяздзе» перакладчык кнігі Патрыярха Паўла прафесар Іван Чарота. — Галоўныя рысы яго — мудрасць у неверагоднай прастаце, велічнасць у сціпласці і смірэннасці, сіла ў дабрыні. Напрыклад, ён сам сабе латаў адзенне, сам чыніў абутак, сам гатаваў ежу на электрычнай плітцы. Усё сваё жыццё ён пражыў як манах у самым поўным разуменні гэтага слова. Адначасова — гэта мудрэц, вучоны-багаслоў і малітоўнік. Ён служыў штодня. Ён быў малітоўнікам выключна адказным перад Богам і людзьмі. Нам, грэшным, цяжка зразумець і спасцігнуць гэту паслядоўнасць і стойкасць у сведчанні веры і імкненні зрабіць усё, каб сербы засталіся ў гісторыі як народ Божы. Усюды паўтаралася фраза, якую сказаў аднойчы ў пропаведзі Патрыярх Павел, і так назвалі прысвечаную яму кнігу: «Будзьма людзьмі нават сярод нелюдзяў». Пайшоў да Госпада ў поўным сэнсе адзін з самых вялікіх прадстаўнікоў сербства і сучаснага Праваслаўя. Больш за 52 гады — архіпастыр. Пры гэтым 34 гады ў Косаве і Мятохіі — у самым эпіцэнтры і перабудовы свету, і тых найскладанейшых працэсаў, якія адбываліся ў Сербіі, ды і ў свеце пры разломе канца ХХ стагоддзя. Гэта пра многае сведчыць. Амаль 19 гадоў — на Патрыяршым прастоле. Прычым менавіта ў лёсавызначальны час. Мне неаднаразова даводзілася чуць ад сербаў, што гэта — жывы святы. Гэта — не метафара. А таму асаблівае значэнне маюць словы малітваслоўя: «Са святымі супакой, Хрысце, душу раба твайго».... Ён быў сапраўды — узор, таму ў параўнанні з ім адразу высвятляецца наша няслушнасць і грэшнасць. У той жа час, гледзячы на гэтага чалавека, вельмі проста зразумець, што ад нас патрабуецца для выратавання…

Пахаванне Патрыярха Паўла адбудзецца сёння, а 13-й гадзіне. Чакаецца, што ў цырымоніі возьмуць удзел Прадстаяцелі або прадстаўнікі ўсіх Памесных Праваслаўных Цэркваў, вялікая дэлегацыя Рымска-Каталіцкай Царквы, прэзідэнты і прэм'ер-міністры шэрагу еўрапейскіх дзяржаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ЗАБІЎ МАЦІ ПАЛКАЙ...

85-гадовую пенсіянерку з Кажан-Гарадка знайшлі мёртвай у сваёй хаце — у жанчыны былі паламаныя рэбры і пашкоджаныя лёгкія. А расправіўся з ёй 47-гадовы сын, які, выпіўшы лішку, схапіў палку...

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» СООБЩАЕТ,**

что аукционные торги по незавершенным строительством объектам коммунальной собственности г. Минска в микрорайонах Михалово-1, Сухарево-2, Дружба-3, объявленные на 8 декабря 2009 года в газете «Звязда за 17.11.2009 г., **отменяются.**

# РАСІЯ «ЗАБЛЫТАЛАСЯ» Ў КАРУПЦЫІ

## Міжнародная арганізацыя сцвярджае, што, нягледзячы на размовы расійскіх уладаў аб барацьбе з гэтай заганнай з'явай, яўнага прагрэсу пакуль не назіраецца

**ЧАРГОВЫ карупцыйны скандал, які прыкаваў да сябе ўвагу як расіян, так і далёка за межамі РФ, грымнуў пасля з'яўлення ў інтэрнэце відэароліка са зваротам маёра Дымоўскага. Афіцэр, якога ўжо літаральна дапякло міліцэйскае бязмежжа, настойвае на асабістай сустрэчы з прэм'ерам Уладзімірам Пуціным і патрабуе навесці парадак у расійскіх праваахоўных органах. Маёр паведамляе пра тое, што начальства патрабуе раскрываць неіснуючыя злачынствы, саджаць невінаватых і, наогул, штурхае да карупцыі.**

Нягледзячы на тое, што маёр не адкрыў для расіян Амерыкі, гэта значыць, нічога новага амаль не распавёў, яго зварот стаў рэзанансным, падштурхнуў расіян зноў да асэнсавання таго, што насамрэч адбываецца ў грамадстве. Зрэшты, самі расіяне не на тэорыі знаёмыя з праявамі карупцыі, таму што ім, мяркуючы па шматлікай інфармацыі, прыходзіцца часта плаціць за «паслугі», што аказваюцца, у прыватнасці, тым жа ўрачам, выкладчыкам... Так, паводле апытання, праведзенага службай **Gallup**, цяпер 66 працэнтаў рэспандэнтаў у Расіі лічаць, што ўзровень карупцыі ў гэтай краіне нашмат вышэйшы, чым у былым СССР, а сямёра з кожных дзесяці расіян кажуць, што ўлады краіны робяць недастаткова, каб перамагчы гэтае зло. Дарэчы, што датычыцца ўладаў, то па прызнанні таго ж апазіцыйнага палітыка **Уладзіміра РЫЖКОВА,** калі б Forbs апублікаваў сапраўдны спіс самых багатых расіян, то палова месцаў у ім была б занятая міністрамі і дэпутатамі. У гэтым сэнсе, мабыць, няшмат энтузіязму надала грамадзянам нашай краіны-суседкі і шырокавядомая ініцыятыва кіраўніцтва РФ наконт абавязковага дэкларавання даходаў чыноўнікаў: у тамтэйшага народа, на жаль, склалася ўражанне, што і гэты захад не ў стане стрымаць карупцыю. Эксперты таксама прызнаюць, што карупцыянеры ў Расіі хутка прыстасоўваюцца да падобных новаўвядзенняў. І сапраўды, навошта ўтойваць інфармацыю пра даходы, тым больш, што хабар ніколі і не дэклараваўся як легальны даход. Іншая рэч, прапануюць некаторыя расійскія палітыкі, прымусіць людзей ва ўладзе паказваць не даходы, а расходы за год. Такі падыход прапануе прыняць, напрыклад, **старшыня нацыянальнага антыкарупцыйнага камітэта Кірыл КАБАНАЎ**. У такім выпадку, зазначае ён, было б лягчэй выявіць тых, хто жыве не па сродках. Праўда, пакуль падобныя эфектыўныя захады чамусьці ў Расіі ігнаруюцца.

Таму і пануе меркаванне большасці экспертаў, што карупцыю ў Расіі пераадолець будзе вельмі складана, паколькі многія з тых, хто набівае кішэні, знаходзяцца пры ўладзе і далей намераў барацьбы з хабарніцтвам справа не зрушваецца. Паводле публікацыі штотыднёвіка **Der Spiegel,** ні ў адной еўрапейскай краіне палітычныя ўстановы не пераплеценыя так цесна з багаццем, як у Расіі, хабар і сямейнасць накладваюць адбітак на жыццё грамадства ў цэлым. Грамадзянам, сцвярджаюць аўтары артыкула, «дастаткова паглядзець на Дзяржаўную Думу, каб страціць усялякую надзею». І тлумачаць, што, у адрозненне ад бундэстага, гэта не парламент юрыстаў і чыноўнікаў, а клуб зорак і багацеяў.

Расійскі прэзідэнт Дзмітрый Мядзведзеў таксама не ў захапленні ад хваробы, якая літаральна раз'ядае краіну, і ворагам нумар адзін абвясціў менавіта карупцыю. Разам з тым, заўважаюць аналітыкі, толькі прызнання самога факта недастаткова. **Дырэктар цэнтра Transparency International у Расіі Алена ПАНФІЛАВА** кажа, што ад эмбрыянальнага этапе барацьбы з карупцыяй, калі пішуцца антыкарупцыйныя законы, неабходна пераходзіць да іх практычнага прымянення. Прычым караць карупцыянераў трэба нягледзячы на чыны і званні, таму што карупцыя вырастае з вышэйшых эшалонаў улады.

Заклапочанасць, якую сёння адносна неэфектыўнасці барацьбы з карупцыяй у Расіі выказваюць многія, цалкам зразумелая. Даўно не сакрэт, што сітуацыя там толькі пагаршаецца: напрыклад, паводле звестак **расійскага МУС,** сярэдні памер хабару за апошні год вырас у 3,5 раза. Міністэрства таксама прыводзіць звесткі, што сярэдні бытавы хабар летась складаў 8 тысяч расійскіх рублёў, а цяпер — ужо 27 тысяч. Як паказала даследаванне **Барометр карупцыі ў Расіі,** летась прыйшлося даваць хабар 17 працэнтам апытаных, а сёлета — 29 працэнтам. А наогул, аб'ём хабару чыноўнікам у Расіі **фонд «Індэм»** ацэньвае ў 318 мільярдаў долараў у год.

Эксперты, якія ўжо зубы з'елі на карупцыйнай тэматыцы, прызнаюць, што выкараніць хабарніцтва будзе складана, і на гэта спатрэбіцца не адзін год, улічваючы вялізныя памеры, якія набыло там падобнае зло. Прычым крыж на карупцыі ўдасца паставіць толькі ў выпадку рэалізацыі шматлікіх планаў барацьбы з ёй. А пакуль, паводле ацэнак міжнародных арганізацый, Расія застаецца моцна карумпаванай краінай.

Пацвярджае гэта, у прыватнасці, абнародаваны на гэтым тыдні **міжнароднай арганізацыяй Transparency International** (яна ўзначальвае барацьбу з карупцыяй) даклад, які прысвячаецца ацэнцы сітуацыі з карупцыяй у свеце. Трэба зазначыць, што згаданая арганізацыя разлічвае індэкс успрымальнасці карупцыі, які дазваляе вызначыць узровень карупцыі ў дзяржаўным сектары — ад «0» (высокі ўзровень карупцыі) да «10» (карумпаваных чыноўнікаў амаль няма). Дык вось у рэйтынгу Transparency International Расія заняла 146-е месца са 180 магчымых. «Суседнічаюць» з Расіяй з аналагічным узроўнем рознага хабарніцтва С'ера-Леоне, Эквадор, Камерун, Кенія, Зімбабве, а аўтсайдарамі названыя М'янма, Афганістан і Самалі. Як адзначаецца ў дакуменце, з цяперашнімі аб'ёмамі карупцыі РФ не зможа зрушыцца ні на крок уперад, не зможа ажыццявіць ні эканамічны, ні навуковы, ні тэхналагічны, ні сацыяльны прарыў. Эксперты арганізацыі кажуць пра тое, што расійскія ўлады вядуць размовы аб барацьбе з карупцыяй, аднак яўнага прагрэсу пакуль не назіраецца. «З аднаго боку, — каментуюць яны, — за апошні год мы неаднаразова чулі рашучыя заявы прэзідэнта Дзмітрыя Мядзведзева пра тое, што ён разглядае барацьбу з карупцыяй як адну з найгалоўнейшых задач свайго прэзідэнцтва. З іншага боку, кожны жыхар Расіі назірае рост карупцыйных праяў».

Акрамя таго, у дакладзе заўважаецца, што расійскія чыноўнікі не змагаюцца з карупцыяй па цалкам зразумелых прычынах. «Большасці бюракратыі, — зазначаецца ў дакуменце, — якая гэты хабар лічыць сваім амаль што нелегітымным даходам, ніякая палітыка па супрацьдзеянні карупцыі, ніякі грамадскі кантроль не толькі не патрэбныя, але і ўяўляюцца натуральнай пагрозай».

Такім чынам, каб выйсці з карупцыйнага тупіку, у якім цяпер знаходзіцца Расія, намаганняў некалькіх чалавек, надзеленых уладай, наўрад ці будзе дастаткова. Таму многія эксперты і вымушаныя з сумам канстатаваць, што, хутчэй за ўсё, кампанія па барацьбе з карупцыяй можа абмежавацца бясконцымі абяцаннямі «па навядзенні парадку».

**Ігар РЫГОРАЎ.**

# ШКОЛЬНІК ПАВЕСІЎСЯ З ЦІКАЎНАСЦІ

**Дзесяцігадовы вучань у адной з вёсак Мядзельскага раёна выпадкова павесіўся з цікаўнасці. Пра гэта паведаміла старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна Калініна.**

Дзіця было знойдзена вісеўшым у пятлі на паддашку хаты. «Яно жыло з бацькамі і старэйшай сястрой. Сям'я характарызуецца станоўча. Па месцы вучобы хлопчык таксама характарызаваўся як вучань, які вызначаўся ўважлівасцю і дапытлівасцю».

Калі яго знайшлі, дзіця вісела ў пятлі з вяроўкі. Пры гэтым яго ногі дакраналіся столевага пакрыцця паддашка. У аналагічным становішчы была знойдзена настаўніца гэтай школы, якая пакончыла жыццё самагубствам 27 верасня. Смерць настаўніцы выклікала вялікі рэзананс сярод вучняў школы, і дзіця пастаянна цікавілася механізмам наступлення смерці пры павешанні, пыталася ў бацькі, ці магла яна вызваліцца з пятлі, маючы апору пад нагамі. Бацькі тлумачылі сыну механізм наступлення смерці пры павешанні, але, будучы па натуры цікаўным, хлопчык вырашыў правесці эксперымент і праверыць на сабе магчымасць вызвалення з пятлі пры наяўнасці апоры пад нагамі.

Пракуратура Мядзельскага раёна правяла праверку па факце смерці вучня. Праверка вызначыла, што падлетак не закончыў жыццё самагубствам, а загінуў у выніку няшчаснага выпадку.

**БЕЛТА.**

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» ИНФОРМИРУЕТ**

В опубликованном в газете «Звязда» от 14 ноября 2009 г. извещении о проведении 27 ноября 2009 года 93-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска:

- название аукциона изложить в следующей редакции: «Извещение о проведении 27 ноября 2009 года 93-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска»;

- содержание текста абзацев 3, 4, 5, 6 приложения изложить в следующей редакции: «Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота на расчетный счет 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в срок, установленный законодательством и решением Мингорисполкома о сдаче в аренду.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись».

**Телефон для справок 227 40 22.**

**Калектыў «Звязды» са смуткам даведаўся пра смерць Міколы ВЯРШЫНІНА — вядомага паэта-сатырыка, чые байкі, фельетоны, гумарэскі і мініяцюры друкаваліся на старонках беларускіх перыядычных выданняў, у тым ліку і ў «Звяздзе». Выказваем самыя шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**ВНИМАНИЕ!**

**В извещении о проведении фондом «Витебскоблимущество» аукциона 18.12.2009 допущена неточность.**

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 14 декабря 2009 г. до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 18 декабря 2009 г. с 14.00 до 14.45.

**ЗАЛЕССКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (ПРОДАВЕЦ)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже 3 (трех) земельных участков для строительства и обслуживания индивидуальных жилых домов:**

**Лот 1** – земельный участок в деревне Гервели, площадь 0,2330 га, кадастровый номер 622083902601000050, начальная цена 3 000 000 белорусских рублей.

**Лот 2** – земельный участок в деревне Залесье, общая площадь участка 0,1800 га, кадастровый номер 622083903101000034, начальная цена 3 000 000 белорусских рублей.

**Лот 3** – земельный участок в деревне Лабы, площадь участка 0,1928 га, кадастровый номер 622083906601000017, начальная цена 2 500 000 белорусских рублей.

Участки размещены на расстоянии 40 километров от города Минска, 20 километров от города Заславля и 35 километров от города Молодечно, в непосредственной близости от участков имеются сети электроснабжения, водоснабжения, вблизи лес, озеро.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона.

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечислить на расчетный счет 3600614100509 в ЦБУ № 605 г. Воложина филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 601, город Воложин, ул. Партизанская,13, назначение платежа 4901, УНП 600037292, Залесский сельский исполнительный комитет.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **17 декабря 2009 года в 10.00** по адресу: деревня Новый Двор, дом 20, помещение Залесского сельисполкома.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **16 декабря 2009 года до 17.00** по адресу: деревня Новый Двор, дом 20, кабинет секретаря сельисполкома, **контактный телефон (8 01772) 32236, сайт в Интернете volozhin.qov.by**

# БАНКІ БЕЛАРУСІ ВЫЗВАЛЯЮЦЦА АД АБАВЯЗКОВАГА ПАКРЫЦЦЯ СТРАТАЎ ПА ЭКСПАРТНЫХ КРЭДЫТАХ

У Беларусі выключана абавязковасць удзелу страхавальніка (банка) у пакрыцці магчымых стратаў у выніку непагашэння экспартнага крэдыту. Адказнасць па іх поўнай кампенсацыі (пры надыходзе страхавога выпадку) ускладзена на беларускае РУП экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант», якім ажыццяўляецца страхаванне экспартных рызык з падтрымкай дзяржавы. Адпаведны ўказ № 552, якім унесены дапаўненне і змяненні ва ўказ ад 25 жніўня 2006 года № 534 «Аб садзейнічанні развіццю экспарту тавараў (работ, паслуг)», Прэзідэнт Беларусі падпісаў 16 лістапада.

Дакументам удасканальваецца сістэма эканамічнага стымулявання экспарту з выкарыстаннем механізмаў страхавой абароны ад камерцыйных і палітычных экспартных рызык.

Прыняцце ўказа дае магчымасць Нацыянальнаму банку выключыць патрабаванні да банкаў аб фарміраванні спецыяльных рэзерваў на пакрыццё магчымых стратаў ад непагашэння экспартнага крэдыту (у памеры да 100 працэнтаў выдадзенага крэдыту), рызыка непагашэння якога застрахавана ў РУП «Белэксімгарант».

Такім чынам, будзе ліквідаваны стрымальны фактар у развіцці экспартнага крэдытавання, таму будуць павялічаны яго аб'ёмы і пашыраны экспартны патэнцыял краіны.

У мэтах недапушчэння зніжэння фінансавай устойлівасці дзяржаўнай страхавой арганізацыі «Белэксімгарант» указам таксама ўстаноўлены яе ўдзел у пакрыцці стратаў па страхаванні экспартных рызык у межах 5 працэнтаў уласнага капіталу (цяпер — да 20 працэнтаў), а сума, якая перавышае названую велічыню, будзе (як і цяпер) выплачвацца за кошт бюджэтных пазык.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Аляксандра Мішарына з выбраннем губернатарам Свярдлоўскай вобласці Расіі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Аляксандра Мішарына з выбраннем губернатарам Свярдлоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Яшчэ адзін гарналыжны цэнтр для беларусаў. Цяпер у Мінску

**Сапраўдны і, як абяцаюць яго стваральнікі, вельмі якасны гарналыжны цэнтр адкрыецца ўпершыню ў гісторыі Мінска. Тое, што было ў парку «Курасоўшчына» да гэтага — нельга параўноўваць.**

Перш за ўсё, «Сонечную даліну» трэба ўбачыць на свае вочы. Так называецца гэта сумеснае прадпрыемства Беларускай федэрацыі гарналыжнага спорту і сноўборда і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта. І, безумоўна, самому паспрабаваць. Тым, хто тут быў раней, будзе цікава даведацца, што асноўны схіл вырас на 12 метраў, стаў даўжэйшы і шырэйшы. Значна павялічылася стартавая пляцоўка, з'явіліся бугельныя пад'ёмнікі, прапускная здольнасць іх цяпер разлічана на 200 чалавек.

Аднак паспрабаваць усё, што прапаноўвае новы гарналыжны цэнтр, можна будзе толькі пасля таго, як выпадзе снег. Тады тут запрацуюць тры схілы — асноўны, вышынёй 25 метраў, даўжынёй 250 метраў і з нахілам 17 працэнтаў, вучэбны і для сноўбордаў, а таксама — лядовы жолаб для катання на цюбінгах.

Але ўжо ў гэтую нядзелю, 22 лістапада, а 14-й гадзіне адбудзецца ўрачыстае адкрыццё гэтага ўнікальнага спартыўнага аб'екта, які пабудаваны так, каб быць запатрабаваным у любое надвор'е і ў любы сезон. У дзень адкрыцця, напрыклад, бясплатна (!) будзе працаваць горка для катання на санях «табаган» (нагадвае «амерыканскія горкі»). У гэты ж дзень тут, нягледзячы на адсутнасць снегу, для гасцей будуць арганізаваны паказальныя выступленні сноўбардыстаў (на схіл дзеля гэтага прывязуць штучны снег з лядовых пляцовак горада), а таксама — конныя выступленні, канцэрт зорак эстрады, а актыўныя члены клубаў «Аптымаліст» і «Саратнік» прадэманструюць прыгажосць здаровага духу ў здаровым целе. Ужо цяпер у Цэнтры працуе кавярня «Мясцечка», а на пад'ездзе абсталяваны паркоўкі.

Аднак галоўная мэта, для якой сталічны гарналыжны цэнтр ствараўся, — гэта магчымасць падрыхтоўкі спартсменаў-гарналыжнікаў і сноўбардыстаў, а таксама навучанне ўсіх аматараў гэтым відам спорту.

— На базе «Сонечнай даліны» будзе працаваць гарадская дзіцяча-юнацкая школа па гарналыжным спорце і сноўбордзе, — расказаў журналістам на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры **дырэктар гарналыжнага цэнтра ў парку «Курасоўшчына» Іван ТРУБАЧАЎ.** — А таксама — трэнеры, якія за плату будуць навучаць ахвотных любога ўзросту. Для навічкоў мы набылі таксама два гарналыжныя трэнажоры «Гарнастай».

Як толькі галоўны будынак «Даліны» будзе здадзены ў эксплуатацыю, там пачне працаваць пракат гарналыжнага і сноўборднага абсталявання. Нават калі снег выпадзе раней, чым завяршаць сваю работу будаўнікі, часовы пункт пракату будзе адкрыты. Прадугледжана тут і сістэма штучнага асняжэння, якая таксама будзе працаваць трошкі пазней і толькі пры тэмпературы не вышэй за — 5° С. Што датычыцца цэнаў, то канчаткова яны пакуль не вызначаны, але кіраўніцтва «Даліны» абяцае, што яны будуць не вышэйшыя за сіліцкія. Вядома ўжо, што адзін спуск на табангу будзе каштаваць 3 тысячы рублёў.

— Рэканструкцыя гарналыжнага цэнтра «Сонечная даліна» прадугледжвае дзве чаргі, — расказаў **выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі гарналыжнага спорту і сноўборду Грыгорый ЛЯДАЎ.** — Пазней тут з'явяцца лодачная станцыя, водныя атракцыёны, лыжаролерная траса, веласіпедныя і бегавая дарожкі, а таксама гасцініца. Будуць працаваць крамы спартыўнага адзення.

Парк «Курасоўшчына» знаходзіцца па вуліцы Казінца, 81-1, рэжым яго працы: з 10 да 22 гадзін, выхадны — аўторак.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о **Шаманаевой Антонине Ивановне,** 1968 г.р., уроженке **Городокского района,** последнее место жительство: Городокский район, д. Антоненки, сообщить в двухмесячный срок с момента публикации данного объявления в суд Октябрьского района г. Витебска по адресу: г. Витебск, ул. Правды, д. 34, каб. 2.14 или 2.6, тел.: 47 71 13, 47 73 39.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о **Дорожкиной Галине Петровне,** 10.04.1968 г.р., уроженке **г. Витебска,** последнее место жительства: г. Витебск, ул. Чапаева, 13—25, сообщить в двухмесячный срок с момента публикации данного объявления в суд Октябрьского района г. Витебска по адресу: г. Витебск, ул. Правды, д. 34, каб. 2.14 или 2.6, тел.: 47 71 13, 47 73 39.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» ИНФОРМИРУЕТ:

1. Информацию об изменении извещения о проведении 27 ноября 2009 года открытого аукциона № 05-А-09, опубликованную в газете «Звязда» от 17.11.2009, **считать недействительной.**

2. В извещении о проведении 27 ноября 2009 года открытого аукциона № 05-А-09 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске (газета «Звязда» от 23.10.2009, газета «Вечерний Минск» от 23.10.2009) вместо слов «Аукцион состоится 27 ноября 2009 года в 11.00» **следует читать «Аукцион состоится 27 ноября 2009 года в 10.00».**

УП «КОМПЛЕКС КОНСАЛТ» (организатор торгов)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже следующих объектов недвижимости:

■ **Лот № 1** — отдельностоящее здание общей площадью 295,2 м², расположенное на земельном участке площадью 0,041 га. Адрес: г. Минск, ул. М. Лынькова, 77. Начальная стоимость — 774 000 000 белорусских рублей.

■ **Лот № 2** — здание склада арочного типа общей площадью 1 117,6 м². Земельный участок в постоянном пользовании площадью 0,7638 га. Адрес: Молодечненский район, д. Красное, ул. 1 Мая, д. 100. Начальная стоимость — 220 000 000 белорусских рублей с учетом НДС (18 %).

■ **Лот № 3** — здание общей площадью 853,8 м². Земельный участок в постоянном пользовании площадью 1 0727,0 га. Адрес: Минский район, Юго-западная окраина п. Селец. Начальная стоимость — 96 600 000 белорусских рублей.

Аукцион состоится **22 декабря 2009 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, к. 209. Задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота перечисляется на р/с УП «Комплекс Консалт» № 3012095930001 в ОАО «Технобанк» г. Минска, код 182, УНП 190454930. Заявки и документы, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **19.11.2009 по 21.12.2009** в рабочие дни с 11.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Свердлова, 2, литер В, пом. 1/К. Срок окончания приема заявок — **21.12.2009 г. в 16.00.**

**Телефоны для справок: (017) 200 42 79, (029) 6 922 644, 682 29 62.**

УНП 190454930.

*Закон Рэспублікі Беларусь*

# АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У НЕКАТОРЫЯ ЗАКОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПЫТАННЯХ ДЗЯРЖАЎНАЙ РЭГІСТРАЦЫІ І ЛІКВІДАЦЫІ (СПЫНЕННЯ ДЗЕЙНАСЦІ) СУБ'ЕКТАЎ ГАСПАДАРАННЯ

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 8 кастрычніка 2009 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 22 кастрычніка 2009 года*

**Артыкул 1.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 лютага 1991 года «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы» ў рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2005 года (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 12 (14), ст. 125; Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 122, 2/1141; 2008 г., № 175, 2/1494) наступныя змяненні і дапаўненне:

1. У артыкуле 5:

у частцы першай пункта 1:

у абзацы трэцім словы «імя, імя па бацьку, пашпартныя звесткі» замяніць словамі «ўласнае імя, імя па бацьку, звесткі дакумента, які сведчыць асобу»;

у абзацы трынаццатым словы «спынення яго дзейнасці» замяніць словамі «яго ліквідацыі»;

пункт 3 пасля слоў «змяненні і» дапоўніць словам «(або)».

2. У артыкуле 6:

з пункта 1 другі сказ выключыць;

пункт 3 выключыць.

3. Артыкул 7 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 7. Дзяржаўная рэгістрацыя фермерскай гаспадаркі**

1. Фермерская гаспадарка лічыцца створанай з даты яе дзяржаўнай рэгістрацыі.

2. Дзяржаўная рэгістрацыя фермерскай гаспадаркі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Для мэтаў дзяржаўнай рэгістрацыі месцам знаходжання фермерскай гаспадаркі можа з'яўляцца жылое памяшканне (кватэра, жылы дом), якое належыць кіраўніку фермерскай гаспадаркі на праве ўласнасці (у тым ліку на праве долевай або сумеснай уласнасці) або з'яўляецца яго пастаянным месцам жыхарства (за выключэннем жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду).».

4. З пункта 1 артыкула 22 словы «і статута фермерскай гаспадаркі» выключыць.

5. Пункт 1 артыкула 31 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«1. Ліквідацыя фермерскай гаспадаркі ажыццяўляецца па падставах і ў парадку, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.».

**Артыкул 2.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 студзеня 1998 года «Аб сумесным домаўладанні» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 7, ст. 88) наступныя змяненні і дапаўненне:

1. У артыкуле 13:

у частцы другой словы «дзяржаўныя датацыі» замяніць словам «субсідыі»;

у частцы трэцяй словы «Датацыі» і «або мясцовага бюджэту» замяніць адпаведна словамі «Субсідыі» і «і (або) мясцовых бюджэтаў».

2. У артыкуле 20:

пасля часткі чацвёртай дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«Адносіны паміж заснавальнікамі таварыстваў уласнікаў у сувязі са стварэннем таварыства могуць рэгулявацца дагаворам аб стварэнні таварыства ўласнікаў, які падпісваецца ўсімі заснавальнікамі таварыства ўласнікаў.»;

часткі пятую — сёмую лічыць адпаведна часткамі шостай — восьмай;

у частцы сёмай слова «моманту» замяніць словам «даты»;

у частцы восьмай словы «статутнымі дакументамі» і «датацый» замяніць адпаведна словамі «статутам» і «субсідый».

3. артыкулы 21 і 22 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 21. Установчы дакумент таварыства ўласнікаў**

Установчым дакументам таварыства ўласнікаў з'яўляецца яго статут.

Статут таварыства ўласнікаў зацвярджаецца агульным сходам яго заснавальнікаў — уласнікаў нерухомай маёмасці сумеснага домаўладання. У выпадку, прадугледжаным часткай чацвёртай артыкула 20 гэтага Закона, статут таварыства ўласнікаў можа быць зацверджаны забудоўшчыкам.

Тыпавы статут таварыства ўласнікаў зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 22. Дзяржаўная рэгістрацыя таварыства ўласнікаў**

Дзяржаўная рэгістрацыя таварыства ўласнікаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.».

4. У частцы чацвёртай артыкула 25 словы «ўстаноўчымі дакументамі» замяніць словам «статутам».

5. Артыкул 28 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 28. Ліквідацыя таварыства ўласнікаў**

Таварыства ўласнікаў можа быць ліквідавана па рашэнні:

агульнага сходу яго членаў. Пры гэтым агульны сход павінен выбраць іншы спосаб кіравання нерухомай маёмасцю сумеснага домаўладання, за выключэннем выпадку, прадугледжанага абзацам трэцім часткі другой артыкула 6 гэтага Закона;

гаспадарчага суда па падставах і ў парадку, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

уласніка нерухомай маёмасці сумеснага домаўладання ў выпадку, прадугледжаным абзацам другім часткі другой артыкула 6 гэтага Закона.

Пры ліквідацыі таварыства ўласнікаў яго маёмасць, што засталася пасля задавальнення патрабаванняў крэдытораў, размяркоўваецца паміж членамі гэтага таварыства ў парадку, які вызначаецца яго статутам.».

**Артыкул 3.** Унесці ў Інвестыцыйны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 22 чэрвеня 2001 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2001 г., № 62, 2/780; 2004 г., № 126, 2/1062; 2006 г., № 122, 2/1256; 2008 г., № 175, 2/1494) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. У частцы другой артыкула 16 і абзацы першым часткі першай артыкула 40 словы «бюджэце Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы (бюджэтны)» замяніць словамі «рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы».

2. У частцы другой артыкула 32 словы «Рэспубліку Беларусь аб бюджэце на чарговы фінансавы (бюджэтны)» замяніць словамі «аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы».

3. У частцы чацвёртай артыкула 77 словы «Мінімальныя памеры статутных фондаў іншых арганізацый і парадак іх стварэння вызначаюцца заканадаўчымі актамі» замяніць словамі «Іншыя арганізацыі ствараюцца і дзейнічаюць у парадку, вызначаным заканадаўствам».

4. У артыкуле 80:

частку другую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Усе камерцыйныя арганізацыі з замежнымі інвестыцыямі разглядаюцца як камерцыйныя сумесныя або камерцыйныя замежныя арганізацыі.»;

частку пятую дапоўніць словамі «(устаноўчым дагаворы — для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе статутнага дагавора)».

5. Артыкул 83 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 83. Дзяржаўная рэгістрацыя камерцыйных арганізацый з замежнымі інвестыцыямі, змяненняў і (або) дапаўненняў, якія ўносяцца ў іх статуты (устаноўчыя дагаворы)**

Дзяржаўная рэгістрацыя камерцыйных арганізацый з замежнымі інвестыцыямі, змяненняў і (або) дапаўненняў, якія ўносяцца ў статуты камерцыйных арганізацый з замежнымі інвестыцыямі (устаноўчыя дагаворы — для камерцыйных арганізацый, якія дзейнічаюць толькі на падставе ўстаноўчых дагавораў), ажыццяўляецца ўпаўнаважаным дзяржаўным органам (далей — рэгіструючы орган) у парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Камерцыйная арганізацыя з замежнымі інвестыцыямі лічыцца створанай з даты яе дзяржаўнай рэгістрацыі.».

6. Артыкулы 84—86 і 89 выключыць.

7. У артыкуле 87:

у частцы першай словы «ўстаноўчых дакументах» замяніць словамі «статуце (устаноўчым дагаворы — для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавора)», словы «з дня дзяржаўнай рэгістрацыі» і «з дня рэгістрацыі» замяніць словамі «з даты дзяржаўнай рэгістрацыі»;

у частцы другой словы «ўстаноўчых дакументах» замяніць словам «статуце»;

частку пятую выключыць;

частку шостую лічыць часткай пятай;

у частцы пятай лічбы «10» замяніць лічбай «3».

8. Дапоўніць Кодэкс артыкулам 87[1] наступнага зместу:

**«Артыкул 87[1]. Прадаўжэнне тэрміну фарміравання статутнага фонду**

Рэгіструючы орган мае права прадоўжыць тэрмін фарміравання статутнага фонду камерцыйнай арганізацыі з замежнымі інвестыцыямі, за выключэннем арганізацый, статутны фонд якіх павінен быць сфарміраваны ў поўным аб'ёме да іх дзяржаўнай рэгістрацыі, на тэрмін да шасці месяцаў з дня заканчэння адпаведнага тэрміну фарміравання статутнага фонду, устаноўленага часткай першай артыкула 87 гэтага Кодэкса.

Для разгляду пытання аб прадаўжэнні тэрміну фарміравання статутнага фонду камерцыйнай арганізацыі з замежнымі інвестыцыямі ў рэгіструючы орган падаюцца наступныя дакументы:

заява з выкладаннем прычын немагчымасці фарміравання статутнага фонду камерцыйнай арганізацыі з замежнымі інвестыцыямі ў адпаведны тэрмін фарміравання статутнага фонду і ўказаннем віду выпускаемай прадукцыі (выконваемых работ, аказваемых паслуг), колькасці прадукцыі (работ, паслуг), якая пастаўляецца на экспарт, колькасці і віду выпускаемай імпартазамяшчальнай прадукцыі (работ, паслуг), памеру статутнага фонду, сфарміраванага на дату падачы заявы, колькасці работнікаў і інфармацыі аб удзеле ў сацыяльных праграмах;

баланс камерцыйнай арганізацыі з замежнымі інвестыцыямі за апошні справаздачны перыяд, за выключэннем выпадкаў, калі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь прадугледжана вызваленне ад абавязку вядзення бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці.

У выпадку неабходнасці рэгіструючы орган запрошвае ў падатковых органаў па месцы пастаноўкі на ўлік камерцыйнай арганізацыі з замежнымі інвестыцыямі даведку аб адсутнасці ў яе запазычанасці перад бюджэтам, у тым ліку дзяржаўнымі мэтавымі бюджэтнымі фондамі.

Рашэнне аб прадаўжэнні тэрміну фарміравання статутнага фонду камерцыйнай арганізацыі з замежнымі інвестыцыямі прымаецца рэгіструючым органам на працягу 30 дзён з дня падачы дакументаў, прадугледжаных часткай другой гэтага артыкула.».

9. У артыкуле 88:

у частцы трэцяй словы «падпісання дагавора аб стварэнні камерцыйнай арганізацыі з замежнымі інвестыцыямі і (або) зацвярджэння статута» замяніць словамі «зацвярджэння статута камерцыйнай арганізацыі з замежнымі інвестыцыямі (заключэння ўстаноўчага дагавора — для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавора)»;

у частцы чацвёртай словы «падпісання дагавора аб стварэнні камерцыйнай арганізацыі з замежнымі інвестыцыямі і (або) зацвярджэння яе статута» замяніць словамі «зацвярджэння статута камерцыйнай арганізацыі з замежнымі інвестыцыямі (заключэння ўстаноўчага дагавора — для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавора)»;

у частцы восьмай словы «ў парадку, які вызначаецца» замяніць словамі «ў выпадку і парадку, якія вызначаюцца».

10. У частках першай і трэцяй артыкула 90 словы «ўстаноўчымі дакументамі» замяніць словамі «статутам (устаноўчым дагаворам — для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавора)».

**Артыкул 4.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 лютага 2002 года «Аб спажывецкай кааперацыі (спажывецкіх таварыствах, іх саюзах) у Рэспубліцы Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 28, 2/842) наступныя змяненні:

1. У частцы пятай артыкула 29 словы «з дня» і «заканадаўствам» замяніць адпаведна словамі «з даты» і «заканадаўчымі актамі».

2. Артыкул 39 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 39. Дзяржаўная рэгістрацыя спажывецкіх таварыстваў і саюзаў спажывецкіх таварыстваў, змяненняў і (або) дапаўненняў, якія ўносяцца ў іх статуты**

Спажывецкія таварыствы і саюзы спажывецкіх таварыстваў набываюць правы юрыдычнай асобы з даты іх дзяржаўнай рэгістрацыі.

Дзяржаўная рэгістрацыя спажывецкіх таварыстваў і саюзаў спажывецкіх таварыстваў, змяненняў і (або) дапаўненняў, якія ўносяцца ў іх статуты, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Пры змяненні складу членаў спажывецкага таварыства і саюза спажывецкіх таварыстваў змяненні і (або) дапаўненні ў іх статуты не ўносяцца.».

3. У частцы першай артыкула 41 слова «заканадаўствам» замяніць словамі «заканадаўчымі актамі».

**Артыкул 5.** Унесці ў артыкул 13 Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года «Аб гідраметэаралагічнай дзейнасці» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 9, 2/1190) наступныя змяненні:

назву артыкула выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 13. Прававыя падставы вытворчасці гідраметэаралагічнай інфармацыі»;**

частку першую выключыць;

часткі другую — пятую лічыць адпаведна часткамі першай — чацвёртай.

**Артыкул 6.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 мая 2007 года «Аб рэкламе» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 119, 2/1321) наступныя дапаўненне і змяненне:

1. Частку першую пункта 5 артыкула 10 дапоўніць словамі «або статута (устаноўчага дагавора — для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавора) са штампам, які сведчыць аб правядзенні дзяржаўнай рэгістрацыі».

2. У частцы першай пункта 1 артыкула 27 словы «з прад'яўленнем яго арыгінала» замяніць словамі «або статута (устаноўчага дагавора — для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавора) са штампам, які сведчыць аб правядзенні дзяржаўнай рэгістрацыі, з прад'яўленнем арыгінала адпаведнага дакумента або яго натарыяльна засведчанай копіі».

**Артыкул 7.** Пры неабходнасці прывядзення юрыдычнымі асобамі статутаў (устаноўчых дагавораў — для камерцыйных арганізацый, якія дзейнічаюць толькі на падставе ўстаноўчых дагавораў) у адпаведнасць з гэтым Законам змяненні і (або) дапаўненні ўносяцца ў статуты (устаноўчыя дагаворы) пры ўнясенні ў іх іншых змяненняў і (або) дапаўненняў, якія падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства. Да прывядзення ў адпаведнасць з гэтым Законам статуты (устаноўчыя дагаворы) дзейнічаюць у частцы, якая не супярэчыць гэтаму Закону.

**Артыкул 8.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін прыняць меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 9.** Гэты Закон уваходзіць у сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА**

*9 лістапада 2009 года, г. Мінск.*
*№ 55—З*

ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 21 декабря 2009 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в г. Гомеле под индивидуальное жилищное строительство

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь (м.кв.) | Начальная цена, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей | Затраты на подготовку документации, бел. рублей | Условия продажи объекта, целевое назначение | Характеристика инженерных коммуникаций, строений и сооружений, инженерно-геологических условий | Порядок предварительного ознакомления с земельными участками | Состояние окружающей среды |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Руднянская, 30, район п. Прибор. См. примечание 2 | 340100000006003164 | 1123 | 5 400 000 | 500 000 | 522 385 | в собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | «Район застройки расположен на расстоянии 10 км от городской черты. Подъезд осуществляется рейсовым автобусом, железнодорожным транспортом, маршрутными такси. По инженерным сетям имеется водопровод, газопровод, ливневая канализация и электроснабжение. Внутриквартальные дороги имеют грунтовое покрытие. См. примечание 1» | Ознакомиться с документацией можно по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, управления коммунальной собственности и приватизации горисполкома, кабинет № 4; с участками в натуре – по месту нахождения участков | Благоприятное. Район защищен лесным массивом и удален на значительное расстояние от промышленных предприятий. |
| 2 | ул. Руднянская, 31, район п. Прибор. См. примечание 2 | 340100000006003438 | 1125 | 5 500 000 | 500 000 | 375 268 | | | | |
| 3 | ул. Волковичская, 25, район п. Прибор. См. примечание 2 | 340100000005004815 | 1103 | 5 400 000 | 500 000 | 386 932 | | | | |
| 4 | ул. Волковичская, 17, район п. Прибор. См. примечание 2 | 340100000005004319 | 1102 | 5 400 000 | 500 000 | 457 715 | | | | |
| 5 | ул. Тереническая, 20, район п. Прибор См. примечание 2 | 340100000006003439 | 1099 | 5 400 000 | 500 000 | 356 707 | | | | |
| 6 | ул. Тереническая, 9, район п. Прибор. См. примечание 2 | 340100000006003442 | 1098 | 5 400 000 | 500 000 | 396 098 | | | | |
| 7 | ул. Узовская, 31, район п. Прибор. См. примечание 2 | 340100000005004318 | 1125 | 5 400 000 | 500 000 | 452 895 | | | | |
| 8 | ул.Узовская, 22, район п. Прибор. См. примечание 2 | 340100000005004315 | 1123 | 5 400 000 | 500 000 | 522 385 | | | | |
| 9 | ул. Поперечная 3-я, 33. См. примечание 3 | 340100000006004102 | 766 | 14 640 175 | 1 400 000 | 856 936 | | Подъезд осуществляется рейсовым автобусом, маршрутными такси. По инженерным сетям имеется водопровод, газопровод и электроснабжение. Внутриквартальные дороги имеют грунтовое покрытие. | | Благоприятное. |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответсвии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. **Аукцион состоится 21 декабря 2009 г. в 15.00** в Гомельском горисполкоме по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию допускаются физические лица, граждане Республики Беларусь, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающие внесение задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

Кроме того, представляются: гражданином – копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт, представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка.

6. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням с **9.00 до 17.00 по 15 декабря 2009 г.** включительно по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, управление коммунальной собственности и приватизациии горисполкома (каб. № 4). Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.50 в день аукциона по указанному выше адресу.

**Примечания:** 1. На перспективу развития по проекту застройки п. Прибор предусмотрено размещение объектов социального, культурно-бытового обслуживания совместно с развитием и расширением существующих объектов Приборского сельского Совета (в связи с тем, что район застройки примыкает к существующей деревне Прибор).

2. Плодородный слой почвы с места застройки снять, сохранить и использовать для благоустройства территории застройки.

3. Ограничения в использовании земельного участка – водоохранная зона р. Сож вне прибрежной полосы площадью 0,0766 га. Плодородный слой почвы с места застройки снять и использовать для улучшения плодородия участка.

**КОНТАКТНЫЕ ТЕЛЕФОНЫ: 77 69 35; 77 67 27; факс: 77 67 27. Информация размещена на сайте: www.qorod.qomel.by**

ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 22 декабря 2009 г. проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение – строительство | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ | Срок аренды, (лет) | Затраты на подготовку документации, бел. рублей | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Мазурова (участок № 1 и участок № 2) | 340100000001004200 340100000001004201 | 0,1189 0,0377 | оздоровительного центра (медицинские услуги, парикмахерская, фотоуслуги, ателье, цветочный магазин) | к землям сельскохозяйственного назначения не относятся | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: участок № 1 – охранная зона канализации – 0,0038 га, охранная зона подземной кабельной линии связи, подземной кабельной линии электропередачи – 0,0196; участок № 2 – охранная зона канализации – 0,0042 га. | 99 | 624 661 | 89 923 009 | 8 990 000 |
| 2 | район улиц Озерная-Приозерная | 340100000003002268 | 0,0855 | здания специолизированного для общественного питания (кафе с летней торговой площадкой) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: прибрежная полоса пруда – 0,0855 га. | 30 | 1 334 091 | 16 756 150 | 1 675 000 |
| 3 | ул. Чечерская | 340100000002004549 | 0,0894 | магазина продовольственных товаров | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона канализации, водопровода – 0,0146 га. | 50 | 981 476 | 16 795 640 | 1 679 000 |
| 4 | ул. Чечерская | 340100000002004567 | 0,0888 | здания специолизированного розничной торговли промышленными (продовольственными) товарами. См. примечание | | участок свободен от застройки. Ограничения в использовании: охранная зона подземной линии электропередачи, водопровода, канализации, теплотрассы – 0,0169 га. | 50 | 1 323 992 | 10 559 610 | 1 055 000 |
| 5 | ул. Нижнебрилевская | 340100000004001161 | 0,0300 | магазина продовольственных товаров | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона напорной канализации – 0,0006 га. | 50 | 551 580 | 4 129 820 | 412 000 |
| 6 | пл. Ленина в районе Киевского спуска | 340100000001004410 | 0,0036 | установка рекламного светодиодного экрана | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. | 5 | 489 215 | 321 830 | 32 000 |
| 7 | пл. Восстания между фабрикой «Труд» и фабрикой «8 марта» | 340100000001004408 | 0,0036 | установка рекламного светодиодного экрана | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. | 5 | 521 311 | 67 040 | 6 000 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. **Аукцион состоится 22 декабря 2009 г. в 15.00** в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: г. Гомель, ул.Советская, 21а, при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

4.1. Представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь представляют доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

4.2. Идивидуальные предприниматели - копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.3. Представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность.

4.4. Представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица - легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина - легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

4.5. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители юридических лиц и граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка.

6. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 16 декабря 2009 г.** включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации (каб. № 4).

Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.50 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

**Примечание:** плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать для благоустройства и озеленения прилегающей территории.

**Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт – www. gorod.gomel.by**

# Краіна здароўя

Выпуск № 47 (161)



# ШМАТАБЛІЧНАЯ АРЫТМІЯ

**Іншы раз вам здаецца, што сэрца гатовае выскачыць з грудзей, а часам яно нібы замірае? Праверце, ці няма ў вас арытміі...**

АРЫТМІЯ — парушэнне частаты, рэгулярнасці і паслядоўнасці сардэчных скарачэнняў.

У сэрцы існуюць асаблівыя клеткі, здольныя самастойна выпрацоўваць электрычны імпульс. Пад уплывам электрычнага імпульсу сэрца скарачаецца. Клеткі, якія выпрацоўваюць імпульс, называюць вадзіцелем рытму. У норме вадзіцелем рытму з'яўляецца сінусавы вузел, размешчаны ў сценцы правага перадсэрдзя, таму нармальны па крыніцы паходжання сардэчны рытм называюць сінусавым. Нармальная частата сардэчных скарачэнняў у стане спакою ў дарослага чалавека складае 66—80 удараў у хвіліну.

Выклікаць збой гэтай узгодненай работы могуць ішэмічная хвароба сэрца, інфекцыйныя, запаленчыя захворванні, асабліва калі яны суправаджаюцца змяненнем тэмпературы цела, парушэнні дзейнасці шчытападобнай залозы, гіпертанічная хвароба. Высокая рызыка развіцця арытміі ў людзей, якія пакутуюць ад цукровага дыябету, асабліва калі ён спалучаецца з атлусценнем і павышаным артэрыяльным ціскам. У здаровага чалавека справакаваць арытмію могуць сытная ежа, цеснае адзенне, запоры, укусы насякомых, некаторыя лекавыя прэпараты, стрэс і, безумоўна, шкодныя звычкі — курэнне, злоўжыванне алкаголем. Схільнасць да арытміі можа перадавацца ў спадчыну, а можа быць і ўскладненнем пасля хірургічнай аперацыі на сэрцы.

Існуе некалькі тыпаў арытміі. Некаторыя з іх бяспечныя і могуць сустракацца нават у здаровых людзей, але ёсць сярод іх і небяспечныя для жыцця.

* ***Тахікардыя*** — вельмі часты рытм, больш як 100—120 удараў у хвіліну. (Бывае так, што напярэдадні якіх-небудзь важных і значных падзей наша сэрца пачынае біцца трывожна і пачашчана. Гэта нармальная з'ява! Галоўнае — каб пасля момантаў узбуджэння роўнае сэрцабіцце аднавілася.)

* ***Брадзікардыя*** — вельмі марудны пульс, менш як 60 сардэчных скарачэнняў за хвіліну. (Дарэчы, у спартсменаў і проста фізічна трэніраваных людзей сэрца б'ецца радзей, чым звычайна — да 45—50 удараў за хвіліну. Падчас сну рытм можа яшчэ больш запавольвацца. І ўсё гэта лічыцца нормай.)

* ***Мігальная арытмія*** — нерытмічныя, хаатычныя скарачэнні сардэчнай мышцы. Гэты від арытміі небяспечны сваімі наступствамі (пагроза тромбаэмбаліі, развіццё сардэчнай недастатковасці).

* ***Экстрасісталія*** — пазачарговае скарачэнне сэрца або яго аддзелаў. Самая распаўсюджаная арытмія, якая ўзнікае як у хворых, так і ў практычна здаровых людзей.

Калі ў звычнай абстаноўцы вы раптам на некалькі секунд страціце прытомнасць або адчуеце слабасць, галавакружэнне, боль або сціскание ў грудзях, задышку, пачашчанае дыханне, не выпрабоўвайце лёс і не займайцеся самалячэннем, а звярніцеся да ўрача-кардыёлага. Ён дасць накіраванне на электракардыяграму, вынікі якой дазволяць вызначыць тып захворвання.

У некаторых выпадках для больш дэталёвага высвятлення прычыны немачы і дакладнай дыягностыкі ўрачы прызначаюць сутачны холтэраўскі маніторынг (хворы 24 гадзіны носіць на сабе маленькі прыбор, запісы якога потым аналізуюцца). Пры неабходнасці могуць быць прызначаны і іншыя спецыяльныя электрафізіялагічныя даследаванні сэрца і сасудаў.

Лячэнне арытміі прызначае толькі ўрач, у залежнасці ад віду і цяжкасці арытміі! Самалячэнне не дапушчальнае! Лячэнне праводзіцца па наступных кірунках: медыкаментозны (антыарытмічныя прэпараты), хірургічны (устаноўка электракардыястымулятара; радыёчастотная аблацыя, калі нармальны рытм сэрца аднаўляецца шляхам прыпякання вельмі маленькага, старанна выверанага ўчастка сэрца пры дапамозе спецыяльнага катэтара).

Аднак не варта перакладваць усю адказнасць за сваё здароўе на таблеткі і спадзявацца на сучасныя метады. Прытрымліваючыся здаровага ладу жыцця, паспрабуйце самі карэктаваць свой сардэчны рытм. Ёсць небяспечныя правакатары ўзнікнення арытміі, ад якіх лёгка пазбавіцца. У першую чаргу гаворка ідзе пра алкаголь, курэнне, злоўжыванне кавай і моцнай гарбатай. Гэтыя згубныя звычкі часцей за іншыя выклікаюць парушэнні сэрцабіцця. Арытмія — не прычына для адмовы ад фізічнай актыўнасці. Але галоўнае — без экстрыму! Пры гэтай немачы вельмі карысныя ўмераныя нагрузкі. Вы можаце аддаць перавагу ёзе, плаванню, пілатэсу і пешым прагулкам. А вось статычных нагрузак пазбягайце. Не падымайце цяжкіх сумак, чамаданаў, не перасоўвайце мэблю, не пілуйце дровы. Статычныя нагрузкі могуць выклікаць рэзкае павышэнне артэрыяльнага ціску, неабходнасць раптоўна актывізаваць работу сэрца нярэдка становіцца прычынай парушэння рытму і тэмпу сардэчных скарачэнняў.

Не забывайце і пра правільнае харчаванне. Ведаеце, чаму ў вегетарыянцаў самае здаровае сэрца? Ды таму, што наша сэрца вельмі любіць агародніну і садавіну (асабліва багатыя на калій курагу, разынкі, абрыкосы, бананы, печаную бульбу). Часцей наладжвайце і «рыбныя» дні. Рэч у тым, што тлустыя кіслоты амега-3, якія ўтрымліваюцца ў рыбіным тлушчы, — лепшыя сябры для сэрца і сасудаў: яны перашкаджаюць утварэнню тромбаў, аднаўляюць сардэчны рытм, змяншаюць колькасць прыступаў пры стэнакардыі і г.д.

Будзьце вельмі ўважлівымі, прымяняючы фітатэрапію. Без парады доктара тут не абысціся: камусьці дапаможа глог, а камусьці — корань валяр'яну. А каб сэрцу было лягчэй, пазбягайце стрэсаў, не драматызуйце падзеі і не заводзьцеся па дробязях. Сэрца ў вас адно.

**** Самы вядомы і просты прыём для нармалізацыі сардэчнага рытму пры частым сэрцабіцці — натужыцца, на 5—10 секунд затрымаць дыханне і напружыць мышцы брушнога прэса. Калі пульс не становіцца радзейшым праз 10—15 хвілін, лічачы ад пачатку прыступу, — выклікайце доктара.***

**** Калі вы пакутуеце ад прыступаў арытміі, то варта паклапаціцца аб тым, каб па магчымасці папярэдзіць іх. Напрыклад, падчас сонечнай актыўнасці — г.зн. магнітных бур — трэба старанна выконваць прызначэнні ўрача і заўсёды мець пры сабе лекі.***

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## АПОШНЯЯ ПРЫСТУПКА

Здароўе нацыі

# ПРЭЗЕРВАТЫЎ — НЕ ШТАНЫ!

## ЯК ЗМАГАЦЦА З ІНФЕКЦЫЯМІ ІНТЫМНАГА ПАХОДЖАННЯ

**ЧАМУ прэзерватыў не на 100 працэнтаў абараняе ад інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам? Якая сувязь паміж апошнімі і немагчымасцю мець дзяцей? Расказвае загадчык кафедры дэрматавенералогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук Леанід БАРАБАНАЎ.**

**(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 18 лістапада.)**

***— Камерцыйныя медцэнтры вядуць статыстыку па палавых інфекцыях?***

— Толькі калі выяўляюць венерычныя захворванні. Іншая рэч, часам яны ставяць дыягназ не ганарэі, а ганарэйнага запаленчага захворвання. Для хворага гэта не так і важна, паколькі яму праводзяць належнае лячэнне, але гэта перашкаджае эпідэміялагічнаму даследаванню, выяўленню і прыцягненню да лячэння яго палавых партнёраў. Урачы, якія разумеюць сур'ёзнасць сітуацыі, імкнуцца ўнушыць пацыенту, што венерычныя захворванні лепей лячыць у дзяржаўных установах. Тым больш, што цяпер у венералагічных дыспансэрах таксама ёсць кабінеты ананімнага лячэння, што дапушчальна ў выпадку з ганарэяй.

Афіцыйна за год рэгіструецца звыш 100 тысяч выпадкаў усіх інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам. Эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя лічаць, што больш аб'ектыўна гаварыць пра 500 тысяч.

***— Адносна жанчын можна атрымаць усё ж такі больш ясную карціну. Любая з нас рэгулярна наведвае гінеколага, здае мазок, які здольны выявіць запаленчы працэс. Мужчыны ж застаюцца ў баку ад такіх даследаванняў...***

— Мужчыны звяртаюцца да спецыялістаў значна радзей, чым жанчыны. Хоць спецыялісты пастаянна паўтараюць, што мужчынам пасля 40 гадоў трэба абавязкова хоць бы раз у год абследавацца прастату. Паказальным у гэтым сэнсе будзе і такі прыклад. У нас шмат выпадкаў трыхаманозу, аднак суадносіны «жанчыны — мужчыны» складаюць 5:1. Павінна быць, зразумела, 1:1. Бывае, мужчыны не хочуць абследавацца і лячыцца. Тады жанчына бясконца хварэе. З іншага боку, калі ў жанчыны ІППШ узнікае паўторна, абодвум партнёрам прапануецца поўнае абследаванне ў вендыспансэры.

***— У якім выпадку неабходна лячыцца?***

— Калі ёсць прыкметы запаленчага працэсу. Калі ж у мазку выявілі метадам флюарысцэнцыі кандыды ці ўрэаплазмы, гэта яшчэ не азначае, што пацыент хворы. Вызначаны дакладныя дыягнастычныя велічыні, перавышэнне якіх патрабуе правядзення лячэння. Так, для кандыдаў гэта — звыш 200 калоній у 1 мл асяроддзя, урэаплазмозу — больш за 10 у 3-й ступені.

***— Заражэнне палавой інфекцыяй не заўсёды праяўляецца запаленчым працэсам?***

— Такія захворванні, як мы гаварылі, могуць працякаць бессімптомна. Абследаванне рэкамендуецца, як правіла, пры наяўнасці скаргаў. А паказаннем можа быць планаванне цяжарнасці, сама цяжарнасць, бясплоднасць, затрымка ўнутрывантробнага развіцця або гібель плода.

***— Наколькі проста дыягнаставаць палавыя інфекцыі?***

— Для дыягностыкі ганарэі цяпер патрабуецца абавязковае правядзенне пасеваў — культуральнага даследавання. Ёсць пэўныя цяжкасці з выяўленнем ганарэі ў насаглотцы, кан'юнктывальным мяшку, паколькі там культуральная дыягностыка патрабуе асаблівых прыёмаў. Што датычыцца сіфілісу, то тут асноўная праблема ў тым, што каля паловы такіх выпадкаў не мае клінічных праяў. Дыягназ жа можна паставіць пасля даследавання крыві. Для вызначэння ВІЧ-інфекцыі адборачным метадам з'яўляецца імунаферментны аналіз, больш дакладным — імунаблотынг ці палімеразна-ланцуговая рэакцыя. Для дыягностыкі ўрэа- і мікаплазмы медцэнтры часам выкарыстоўваюць імуналюмінісцэнтную дыягностыку, а яна не дазваляе сцвярджаць, ці патрэбна хвораму лячэнне. Патрабуецца культуральнае даследаванне, або пасеў, падлік калоній. Што да хламідый, то апошнім часам спецыялісты схіляюцца да таго, каб ставіць дыягназ пасля абследавання двума рознымі метадамі. Адзін з іх павінен быць залатым стандартам — палімеразна-ланцуговая рэакцыя або пасеў.

***— Ці існуе праблема інфарматыўнага мазку?***

— Выявіць інфекцыю ў жанчыны насамрэч не так і проста. Калі ў вас ёсць скаргі, а вам сказалі, што мазок добры, гэта не гарантыя здароўя. Культуральнае даследаванне можна пацвердзіць метадам палімеразна-ланцуговай рэакцыі. Калі ў жаночай кансультацыі няма магчымасці правесці такі аналіз, там могуць парэкамендаваць, дзе гэта зрабіць. Трэба заўважыць, нашы буйныя камерцыйныя медцэнтры працуюць даволі нядрэнна.

***— За межамі сталіцы таксама няма праблем з падобным відам абследавання?***

— У абласных цэнтрах — так, а вось у раённых складаней. Той жа метад палімеразна-ланцуговай рэакцыі выконваецца пакуль толькі ў абласцях.

***— Якім чынам запаленчы працэс спрыяе бясплоднасці?***

— Бактэрыі выклікаюць павелічэнне кровапанаўнення, парушэнне адміранне клетак, выхад лейкацытаў з крыві, фарміраванне гнойнага ачагу. Калі запаленне адбываецца ў канале шыйкі маткі, там змяняецца хімічны склад слізістай пробкі і сперматазоід гіне, бо не здольны трапіць у поласць маткі. Калі ж запаляецца слізістая самой маткі, то пасля апладнення яйцаклетка не можа замацавацца ў яе поласці. Запаленне прыдаткаў маткі тым больш не спрыяе цяжарнасці. У фалопіевых трубах, якія меншыя за чалавечы волас, утвараецца ацёк, яны зліпаюцца і становяцца непраходнымі. А дзе адбываецца апладненне? У трубе. У мужчын запаленчы працэс мочапалавых органаў таксама мяняе хімічны склад сакрэту, зніжае колькасць і рухавасць сперматазоідаў.

Пасля лячэння інфекцый праводзіцца кантроль яго эфектыўнасці — самым адчувальным метадам. Так, для пачатку лячэння тых жа ганакокаў дастаткова іх выяўлення ў мазку, аднак пасля лячэння трэба праверыць вынік з дапамогай пасеву, бо ганакок можа змяніць свае вартасці, перастаць выяўляцца ў мазку, але захоўвацца ў ачагах і даваць рост тыповых калоній. Што да лячэння ў цэлым, то сёння распрацаваныя вельмі эфектыўныя схемы. Практычна ўвесь арсенал лекавых сродкаў, якія выкарыстоўваюцца ў свеце, прысутнічае ў нашай аптэчнай сетцы.

***— Пры ўмове правільнага выкарыстання прэзерватыва інфіцыравання можна пазбегнуць...***

— Можна. Праўда, пры сіфілісе, напрыклад, сустракаюцца так званыя прэзерватыўныя шанкры. Шанкр можа размяшчацца не толькі на той частцы, якая прыкрываецца прэзерватывам. Прэзерватыў усё ж такі — не штаны.

**Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.**

Сіла слова

# «Не пі, не пі, чалавеча, беражыся...»

Падчас нашых вандровак па рэспубліцы даводзілася запісваць не толькі замовы ад бяссонніцы, ад усялякіх хваробаў, але і ад розных адмоўных сацыяльных праяў жыцця вяскоўцаў таксама. Здавён павялося, што чалавеку працы вельмі давалася ў знакі п'янства. І не так яшчэ селяніну, як сялянцы, жанчыне, гаспадыні, жонцы. Менавіта слабай палавіне даводзілася потым і сплачваць прапітае ці ўкрадзенае, і на сваіх плячах і целе адчуць фізічнае ўздзеянне падвыпітага гаспадара. Агаворымся яшчэ — тады мы мэтанакіравана адшуквалі замовы такой тэматыкі. Калі пачалі займацца гэтым, то аказалася, што яны вельмі рэдка сустракаюцца. Мала гэтага, далёка не кожны інфарматар, які ведаў такі твор, пагаджаўся нам яго пераказаць пад запіс, тлумачачы гэта тым, што замова, перададзеная выпадковаму чалавеку, адразу ж страціць сваю магутна-чараўнічую сілу. Падаем найбольш характэрныя прыклады.

«Як адлучыўся Іюда ад Хрыста, так няхай адлучыцца (раб божы — імя) ад віна. Амінь. Амінь. Амінь». («Ад выпіўкі», в. Чухава); «Свяшчэнніку ў школе не чытаць, рабе божаму Івану гарэлкі не знаці. Дзевяць царквей, дзясятая памашчніца, Божая Маці начальніца. Амінь» («Ад мужа-выпівохі», в. Ботава); «Неба бяскрайняе, звёзды міргаючыя, усміріце ад віна, злога зелля і запою. Усёмагутны месяц, адваражы (імя) ад запою, віна і зелля. Сонца ўсёмагутнае, спалі запойную страсць у (імя), усміры і ўкраці смагу і жаднасць у (імя) да запою, віна і зелля. Вецер ціхі, вецер буйны уймі запойную страсць у (імя). Хоць моцны і крэпкі чортаў напой, сатанінская замова, але мая замова, мае словы — мацнейшыя і лепшыя. Амінь» («Ад моцнага выпівання», в. Дабраслаўка); «У імя Атца, Сына і Святога Духа. Амінь. Запой і віно зялёнае адступіцеся ад раба божага (імя) ў цёмныя лясы, дзе людзі не ходзяць і коні не бродзяць, і птушкі-салавейкі не спяваюць. Амінь» («Замова ад частага выпівання», в. Юзэфіны); «Свят-свяціцель, душэўны мучыцель, атраві водкай мужа, каб ён не піў, на водку не глядзеў, за віно не браўся, нячыстай сілы не баяўся, а ваду піў, сямейку сваю весяліў, да печы падыходзіў і пячаль-смутак адводзіў. Хлеб будзе есці, а смутак да сябе не будзе несці. Амінь (тры разы прагаварыць на бутэльку са спіртным, калі раніцай аддаваць яе мужу піць, то перад гэтым яшчэ тройчы пабоўтаць)» («Забабон ад алкагалізму», в. Круглае); «Зайсці ў свінушнік і ў тым месцы, дзе стаяла свіння, сабраць салому. Ці што ёсць іншае ў гурбу, потым прынесці на гэтае месца бутэльку гарэлкі (можна віна альбо піва ці самагону) і прагаварыць тры разы: «Свіння і тая водкі не выпівае, а памыі паядае. Так і ты, раб божы (імя), водкі не пей і праз яе ніколі не хварэй». З той бутэлькі даць выпівоху выпіць і ў яго адразу ж ахвота спадзе» («Ад алкагалізму», в. Лышча); «Калі мужык, які пакутуе запоем, заснуў і каб пасля гэтага назаўсёды перастаў выпіваць, то зрабіце наступнае: падрыхтуйце кавалак воску, і калі ён пачне зноў піць і закусваць, умудрыцеся прылаўчыцца і зрабіць так, каб мужык гэты воск укусіў, а яшчэ лепей, каб праглынуў. Калі чалавек зноў засне, то над ім прагаварыце наступныя словы: «Зара-зараніца, красная дзявіца, сама маці і царыца. Светлы месяц, ясныя звёзды, вазьміце ў мяне бяссонніцу, бездрамотніцу, паўночніцу. Сярод ночы прыйдзі да мяне, хоць краснаю дзявіцаю, хоць маці-царыцай, забяры з мяне і звядзі з мяне акаянную сілу. І дай мне спасаву руку, Багародзіцын замок. Ангел мой, архангел мой, сахрані душу маю, скрапі сэрца маё. Ворага сатана адыдзі назаўсёды ад мяне. Крастом крашчуся, крастом аграджуся, крастом ангела прыклікаю, крастом атганяю лукавага. Ва імя Айца, Сына і Святога Духа. Амінь» (пасля яшчэ трэба зашыць кавалачак замоўленага воску выпівоху ў вопратку і ніколі нікому не гаварыць пра гэта, каб яно назаўсёды заставалася таямніцай). («Замова ад алкагалізму», в. Бярозавічы).

Ёсць катэгорыя замоў, якая павінна была адмаўляць выпівох не проста ад частага выпівання, але выводзіць іх з хранічнага запою. Такія замовы лічыліся найбольш моцнымі, хоць па нейкіх сваіх мастацкіх асаблівасцях, вобразнасці не вылучаліся сярод іншых. Нашы інфарматары аднагалосна сцвярджалі, што такія вуснапаэтычныя творы прамаўляліся над няшчаснымі людзьмі толькі спрактыкаванымі знахарамі. «Сам Гасподзь на небе, а цар — на зямлі, а мядзведзь — у лесе, а мярцвец — у зямлі. Мёртвыя ляжаць, ляжаць яны — не выпіваюць, не ядзяць. Няхай мядзведзь гарэлку выпівае, а Васілёк — і ў рот не бярэ» («Замова ад запою», в. Чухава); «Чабрэц-траву сабраць на Іванаў дзень, кінуць у спіртное і прагаварыць: «Багародская трава, Багародзіцы галава, уразумі раба божага (імя), каб хмяльное ніколі не піў, стаканы не хапаў, брагі-водкі не глытаў. Як слова — так і справа. Амінь» («Замова ад запою», в. Новы Двор); «Ва імя Айца і Сына, і Святога Духа. Зямля — ты мая маці, прыкажы мне рабу божаму (імя), ад сяго ўгоддзя ўзяць добрую траву Зарахіль. Табе, маці Зямля, на стаянне, а мне для рабоў і рабынь, для лішэння іх ад выпівання.. Каб гэты раб божы (імя), пра віно не думаў, вачыма на яго не глядзеў, вуснамі не чуў і адбягаў ад віна. Як тошна паміраць, так бы ташнілася рабу божаму (імя). Адныне і да веку. Амінь» («Замова ад запою», в. Сташаны).

**Аляксей НЕНАДАВЕЦ.**

## НА ХРАНІЧНУЮ АБСТРУКТЫЎНУЮ ХВАРОБУ ЛЁГКІХ ХВАРЭЮЦЬ 210 МЛН ЧАЛАВЕК

**Па ацэнках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ), на хранічную абструктыўную хваробу лёгкіх (ХАХЛ) хварэюць 210 млн чалавек.**

У Сусветны дзень барацьбы супраць хранічнай абструктыўнай хваробы лёгкіх, які адзначаецца 18 лістапада, робяцца глабальныя крокі па павышэнні паінфармаванасці аб ХАХЛ і паляпшэнні дапамогі пацыентам. Па прагнозах СААЗ, да 2030 года ХАХЛ стане трэцяй па значнасці прычынай смерці ва ўсім свеце. Асноўнымі фактарамі рызыкі развіцця ХАХЛ з'яўляюцца курэнне тытуню, забруджванне паветра ўнутры памяшкання і на вуліцы, а таксама ўздзеянне пылу і хімічных рэчываў на працоўных месцах.

Гэты дзень заснаваны Глабальнай ініцыятывай па барацьбе супраць хранічнай абструкцыйнай хваробы лёгкіх. ХАХЛ — гэта хвароба лёгкіх, якая пагражае жыццю, перашкаджае нармальнаму дыханню, гэта больш, чым «кашаль курца». Амаль 90 % выпадкаў смерці ад ХАХЛ адбываецца ў краінах з нізкім і сярэднім узроўнем даходу. Хвароба паражае мужчын і жанчын амаль раўнамерна (часткова гэта звязана з ужываннем тытуню, якое ўзрасло, сярод жанчын у краінах з высокім узроўнем даходу). ХАХЛ невылечная, але лячэнне дазваляе замарудзіць развіццё хваробы.

Па прагнозах СААЗ, калі не будуць прынятыя меры, накіраваныя на змяншэнне рызыкі, асабліва на зніжэнне ўздзеяння тытунёвага дыму, агульная смяротнасць ад ХАХЛ у бліжэйшыя 10 гадоў узрасце больш чым на 30 %.

Самымі распаўсюджанымі сімптомамі ХАХЛ з'яўляюцца задышка (або адчуванне недахопу паветра), паталагічная макрота (сумесь сліны і слізі ў дыхальных шляхах) і хранічны кашаль. Па меры паступовага развіцця хваробы можа значна ўскладняцца штодзённая фізічная актыўнасць, такая, як пад'ём на некалькі прыступак па лесвіцы або перанос чамадана.

**Алена ПРУС, БЕЛТА.**

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 18 декабря 2009 г. в 10.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, состоится АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Бобруйскагромаш», в составе Лота № 1:**

| | |
|---|---|
| **Наименование имущества, входящего в состав лота:** | **Комплекс зданий, сооружений и оборудования, расположенный по адресу: Могилевская обл., Кировский р-н, около д. Чигиринка в квартале № 108 Чигиринского лесничества Государственного лесохозяйственного учреждения «Бобруйский лесхоз», в составе:**<br>- кап. строение с инв. № 712/С-2520 (здание базы отдыха «Изумруд») общ. пл. 235,0 кв.м;<br>- кап. строение с инв. № 712/С-2521 (туалет) общ. пл. 10,0 кв.м;<br>- кап. строение с инв. № 712/С-16144 (ограждение территории базы отдыха) протяженностью 555,8;<br>- кап. строение с инв. № 712/С-16145 (тротуар бетонный) площадью 15,0 кв.м;<br>- кап. строение с инв. № 712/С-16146 (артезианская скважина) глубина 62,0 м;<br>- кап. строение с инв. № 712/С-16147 (комплексная трансформаторная подстанция (ограждение) площадью 2,3 кв.м;<br>- кап. строение с инв. № 712/С-16148 (водопровод) протяженностью 150,0 м;<br>- кап. строение с инв. № 712/С-16161 (электросети) протяженностью 130 м;<br>**- в том числе:** оборудование комплексной трансформаторной подстанции КТП 160 х 10 |
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509), г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 |
| **Начальная цена продажи, рублей с учетом НДС** | 149 503 051 |
| **Размер задатка, рублей** | 7 475 150 |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | **Получатель платежа ОАО «Бобруйскагромаш» – р/с 3012000360025 в Первомайском отд. ОАО «БелПСБ» г. Бобруйска, код 329, УНН 700067572, ОКПО 00238776** |
| **Площадь земельного участка** | **1,8596 га** – кадастровый № 722583200001000002, правовой режим – пост. пользование |
| **Характеристика объектов** | **здание базы отдыха «Изумруд»**, одноэтажное, бревенчатое, 1978 г.п, фундамент бетонный, перекрытия деревянные, кровля шиферная, полы дощатые; **здание туалета,** одноэтажное, кирпичное на 8 очк., фундамент бетонный, перекрытия отсутствуют, кровля шиферная, полы бетонные; **ограждение территории базы отдыха,** металлическая сетка, ворота металлические, калитка металлическая (3 ед.) |
| **Условия продажи** | аукцион без условий |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | **по 17 декабря 2009 г. включительно** |

**Для участия в аукционе в адрес Организатора торгов необходимо предоставить:** заявление на участие; заверенную банком копию платежного поручения о внесении размера задатка, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр.статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (рус.) язык; **представителям юр. и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.** Задаток, внесенный Победителем, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **Организатор торгов или Продавец вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.**

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляет Победитель (Претендент на покупку) не позднее 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов до проведения аукциона.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

# «ХТО БАЗІЛІК ЖУЕ, ТОЙ ДОЎГА ЖЫВЕ»,

— гаворыць народная прымаўка.



Назва гэтай расліны з грэчаскай мовы перакладаецца як «кароль». І сведчыць аб наступным: базілік здаўна лічыўся прыправай, вартай прынцаў і каралёў.

Сцёблы, лісце і чашачкі базіліку шурпатыя навобмацак. У іх размешчаныя залозкі, дзе накопліваецца эфірны алей, які і абумоўлівае водар гэтай расліны, а таксама прыемны пах і смак страў, у якія яна дадаецца.

Базілік багаты на вітамін Р, які ўмацоўвае капіляры, садзейнічае лепшай іх пранікальнасці, а таксама разам з правітамінам А адыгрывае вялікую ролю ў абменных працэсах, нармалізуе хуткасць аднаўлення клетак, стымулюе сінтэз калагену ў скуры, робячы яе маладой і пругкай. Як вядома, вітаміны лепш за ўсё атрымліваць знутры, таму базілік на стале — цудоўны прыродны спосаб амаладжэння.

Базілік проста панацэя ад прастудных захворванняў — зніжае тэмпературу, змяншае насмарк, аказвае супрацьзапаленчае дзеянне і танізуе. З ім нават можна паласкаць горла.

Акрамя таго, базілік рэкамендуецца ўжываць пры артрыце і рэўматызме, для стымуляцыі стрававання і зняцця галаўнога болю.

Па сваіх карысных уласцівасцях не ведае роўных і базілікавы алей, для вытворчасці якога вырошчваюцца спецыяльныя гатункі. Дзякуючы багатаму хімічнаму складу, алей базіліку аказвае моцнае антыбактэрыяльнае дзеянне, не саступаючы па сіле некаторым антыбіётыкам. Пах гэтага алею аскомісты, востры і гаркаваты. І лепш за ўсё спалучаецца з водарамі бергамоту і імбіру.

Водаратэрапеўты рэкамендуюць выкарыстоўваць алей базіліку для ўмацавання імунітэту. Базілік здымае галаўны боль, павышае настрой, праганяе сімптомы нервовага знясілення і стомленасці. Таксама яны сцвярджаюць, што з дапамогай алею базіліку можна набыць яснасць розуму, пазбавіцца ад меланхоліі. І нават павысіць самаацэнку і пераадолець комплексы.

У касметалогіі базілікавы алей знайшоў прымяненне дзякуючы сваім антыаксідантным уласцівасцям. У складзе крэмаў і ласьёнаў базілік паспяхова змагаецца са свабоднымі радыкаламі, танізуе скуру, разгладжвае дробныя маршчынкі. У сродках догляду валасоў — алей базіліку перашкаджае іх выпадзенню і ломкасці. Акрамя таго, яго карысна трымаць пад рукой, калі вы вырашылі адправіцца на прыроду: ён хутка здымае смыленне, сверб і ацёк пасля ўкусу насякомых.

**УВАГА!** Алей базіліку дастаткова моцны сродак, таму неабходна захоўваць асцярожнасць. Прэпараты з базілікам не падыходзяць для цяжарных і людзей з павышанай згусальнасцю крыві. Акрамя таго, базілікавым алеем нельга карыстацца больш як тры тыдні запар.

### ПАМІДОРЫ, ЗАПЕЧАНЫЯ З БАЗІЛІКАМ

*Вазьміце:* 8 мясістых памідораў сярэдняй велічыні, пучок базіліку, 200 г сыру гаўда, чорны перац і соль на смак.

Вымытыя і абсушаныя памідоры разрэжце на палавінкі. Асцярожна дастаньце чайнай лыжкай мякаць, здрабніце яе нажом і змяшайце з дробна насечаным базілікам, дзёртым сырам, соллю і перцам. Напоўніце палавінкі памідораў начынкай і пастаўце ў гарачую духоўку на 15 хвілін.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## ЗАНЯТКІ ПРАВОДЗІЛІ САБАКІ

**Упершыню ў Магілёве, у сярэдняй школе № 9, прайшоў сеанс лячэбнай кіналогіі. У ім бралі ўдзел вучні, якія маюць парушэнні слыху, і выхаванцы кіналагічнага клуба «Алькор».**

Дзеці гулялі з дружалюбнымі тэр'ерамі і рэтрыверамі, гладзілі сабак і радаваліся зносінам з прыгожымі і ласкавымі жывёламі. Падаецца — звычайная справа, але па-навуковаму гэта называецца карэкцыйна-выхаваўчай працай. Лячэбная кіналогія выкарыстоўваецца для сацыяльнай адаптацыі і развіцця дзяцей з парушэннямі слыху. Такім малым патрэбныя разуменне і клопат, а сабакі — эмацыйныя жывёлы, яны разумеюць маленькіх сяброў без слоў.

Гэты педагагічны праект працягнецца: вучні школы № 9 будуць сустракацца з кінолагамі раз на месяц.

**Ілона ІВАНОВА.**

З нагоды

# ПРАФЕСІЙНАЕ СВЯТА — У ПОЛІ!




**«СТАЛІНГРАД быў пагібеллю нямецка-фашысцкай арміі» — напісаў калісьці Сталін. Якраз 67 гадоў таму, 19 лістапада 1942 года магутнай артылерыйскай падрыхтоўкай пачалося наступленне Чырвонай Арміі ў ходзе Сталінградскай бітвы. Гэтая дата і была абвешчана Днём артылерыі. Сучасная Беларусь працягнула традыцыю, і сёння мы адзначаем Дзень ракетных войскаў і артылерыі.**

Цікава, што беларускія артылерысты і ракетчыкі, якія цяпер праходзяць службу ва Узброеных сілах, адзначаць сваё прафесійнае свята будуць не на «зімовых кватэрах», а ў палявых умовах: якраз цяпер праводзіцца восеньскі лагерны збор.

— Зборы завершацца ў трэцяй дэкадзе лістапада, прафесійнае свята, як і належыць артылерыстам, будзем адзначаць у полі, — сказаў журналістам **палкоўнік Валерый ЦЯСЛЕНКА, начальнік ракетных войскаў і артылерыі Паўночна-Заходняга аператыўнага камандавання**. Дарэчы, Валерый Віктаравіч лічыць, што ракетныя войскі і артылерыя з'яўляюцца асноўным сродкам агнявога паражэння: па вопыце апошніх узброеных канфліктаў менавіта на гэтыя роды войскаў прыходзіцца каля 60—70 % усіх агнявых задач па паражэнні аб'ектаў праціўніка.

Як адзначаюць вайскоўцы, сёння на ўзбраенні ў Беларусі стаяць самыя сучасныя ракетныя комплексы і рэактыўныя сістэмы залпавага агню, самаходныя артылерыйскія сістэмы і супрацьтанкавыя ракетныя комплексы, сярод якіх можна назваць 2С3М «Акацыя», 2С5 «Гіяцынт», 2С19 «МСТА», БМ-21-А «БелГрад», 9П149 «Штурм-С», 9П148 «Конкурс», 9П135 «Фагот», 9К79 «Кропка». Цяпер усё гэтае ўзбраенне выведзена на палігон на вучэнні, аднак, напрыклад, апошні пуск ракетнага комплексу 9К79 «Кропка» ў Беларусі быў у 1998 годзе. Што, дарэчы, не дзіўна, бо адна такая ракета каштуе як пяціпавярховы дом на тры пад'езды.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**



## НЕРАСТ ЛАСАСЁВЫХ У БЕЛАРУСІ — ПАД ГРАМАДСКІ КАНТРОЛЬ

**У Астравецкім раёне праходзіць акцыя экалагічных актывістаў «Захаванне ласасёвых рыбаў у рэках Беларусі». Яе мэта — дапамога дзяржаўным прыродаахоўным структурам у барацьбе з браканьерствам.**

У рэках нашай краіны нерасцяцца кумжа і атлантычны ласось (сёмга) — адны з самых рэдкіх відаў рыбаў у Беларусі, якія ўнесены ў Чырвоную кнігу (летась «Звязда» падрабязна пісала пра гэта).

З'явіўшыся з ікрынак і правёўшы пэўны час у рэках нашай краіны, маладыя рыбы «скатваюцца» ў Балтыйскае мора, каб праз некалькі гадоў вярнуцца ў свае родныя мясціны на нераст.

Цяпер дарослыя асобіны кумжы і сёмгі могуць уздымацца толькі па рацэ Віліі, хоць раней для іх міграцыі былі прыдатнымі і Нёман, і Заходняя Дзвіна, і Заходні Буг. На шляху рыбы шмат перашкод (плаціны, забруджанасць вады), але галоўнай, бадай, з'яўляецца браканьерства падчас нерасту. Як кажуць экалагічныя актывісты, жаданне здабыць ласося прыцягвае ў рэгіён парушальнікаў нават з іншых куткоў Беларусі. Гэта нягледзячы на тое, што памер кампенсацыі шкоды за адну асобіну кумжы ці сёмгі складае 6 базавых велічынь, а памер штрафу — ад 10 базавых велічынь. Таму назіранне за ласасёвымі рыбамі і праца па прафілактыцы і выяўленні браканьерства будзе доўжыцца да канца нерасту — да канца снежня. У гэты перыяд будуць арганізаваныя валанцёрскія лагеры ў Астравецкім раёне. Узяць удзел у іх могуць усе неабыякавыя да праблемы людзі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Рэха публікацыі

# БУДЗЬМА БОЛЬШ ДАКЛАДНЫМІ І РАЗВАЖЛІВЫМІ

**Прывітанне, шаноўная рэдакцыя.**

**Зноў узнікла патрэба мне выказацца на старонках вашай газеты. На гэты раз мяне зачапіў артыкул «Годны помнік героям Грунвальдскай бітвы» ад 10 лістапада 2009 г. Як гісторыка мяне гэты артыкул вельмі незадаволіў, бо матэрыял пададзены вельмі недакладна і зашмат недарэчнай патэтыкі.**

І цяпер больш дакладна, па ўсім артыкуле па парадку.

Чаму аўтар назваў гэту бітву найвялікшай у сярэднявеччы? Ён дакладна ведае ўсе бітвы, што адбываліся ў сярэднявеччы і ўпэўнены, што Грунвальд на той час з'яўляецца найвялікшай бітвай? Аўтар называе Тэўтонскі ордэн самай магутнай дзяржавай таго часу. Гэта значыць, што адзін гэты ордэн з'яўляўся больш магутным, чым, напрыклад, уся Свяшчэнная Рымская імперыя? Смешна.

Расія называлася Рускім царствам ужо задоўга да Пятра I, яшчэ з часоў Івана Жахлівага. Іншая рэч, што Масковіяй Расію маглі на той час называць нашы продкі па звычцы, як мы часта, не задумваючыся, называем ЗША проста Амерыкай. Але ж тады трэба пра гэта казаць асобна.

Правільна, параўноўваць Грунвальд з бітвай на Чудскім возеры нельга. Але казаць, што Грунвальд зрабіў велізарны ўплыў на ўсю наступную гісторыю Еўропы... Гэта ўжо занадта... Трэба ж хаця б крыху ўяўляць сабе памеры ўсёй Еўропы.

А наступны выраз мяне ўвогуле «забіў». «... пад Грунвальдам удзельнічалі сотні тысяч воінаў з абодвух бакоў, ...». Цікава, сам аўтар ці чытаў калі-небудзь якуюнебудзь навуковую літаратуру пра Грунвальд? З боку Тэўтонскага ордэна ўдзельнічала каля 20 тысяч вершнікаў і прыкладна 5—10 тысяч пехацінцаў. З боку саюзнага войска было каля 30 тысяч вершнікаў і некалькі тысяч пехацінцаў. Калі нават скласці ўсіх удзельнікаў, то атрымаецца самае вялікае 60—65 тысяч. Якія сотні тысяч?

Я згодны з аўтарам, што святкаваць 23 лютага Дзень Савецкай Арміі нам, беларусам, неяк недарэчы. Зноў успомнім гісторыю. 23 лютага сталі святкаваць у Савецкай Расіі ў сувязі з падзеямі 1918 года, калі рэвалюцыйны Петраград паспрабаваў стрымаць войскі кайзэраўскай Германіі, якія наступалі на горад. Я не спрачаюся, для Расіі гэта насамрэч, магчыма, важная падзея. Але прычым тут Беларусь? Усё ж такі нам трэба стварыць нейкае сваё свята, звязанае непасрэдна з нашай гісторыяй. А вось з выбарам даты я зноў не пагаджуся з аўтарам.

Нягледзячы на значнасць для Беларусі Грунвальда, зрабіць з яго наша нацыянальнае свята, на мой погляд, будзе не зусім карэктна. Чаму? Зноў па пунктах:

1) сама бітва адбывалася не на беларускай тэрыторыі, хоць і ў абарончых мэтах;

2) у саюзным войску армія ВКЛ (адпаведна і колькасць беларусаў) складала меншую частку;

3) склад варагуючых армій быў шматнацыянальны (сярод саюзнікаў — беларусы, украінцы, летувісы, татары, палякі, чэхі, магчыма нават малдаване; сярод тэўтонцаў — немцы, палякі, прусы, чэхі, мараўцы, швейцарцы), таму гэтую перамогу з такім жа поспехам могуць сабе прыпісаць іншыя ўдзельнікі бітвы;

4) наша саюзнае войска мела хоць і невялікую, але колькасную перавагу, таму нашу перамогу можна назваць адносна заканамернай.

На мой суб'ектыўны погляд, на ролю беларускага дня абаронцы Айчыны больш пасуе дата 8 верасня 1514 г., калі адбылася Аршанская бітва. І зноў па пунктах, чаму:

1) у адрозненне ад Грунвальда пад Оршай лік войскаў насамрэч пайшоў на сотні тысяч (каля 110 тысяч), што адразу ставіць яе на парадак вышэй за Грунвальд;

2) колькасць войскоўцаў ВКЛ саступала арміі праціўніка амаль у 3 разы (30 тысяч супраць 80), што даказвае: перамога беларускіх войскаў — гэта выключна заслуга іх вайсковага майстэрства, а не колькасці;

3) асноўную колькасць арміі ВКЛ складалі выхадцы з беларускіх зямель, дапаможныя часткі палякаў складалі меншасць;

4) бітва адбылася на тэрыторыі Беларусі, што паказвае яе выразна абарончы характар.

Можна назваць яшчэ многа розных прычын. Напрыклад, і такія практычныя, што беларусам лягчэй святкаваць дзень сваёй вайсковай славы і наведаць гэтае славутае месца ў сваёй краіне, чымсьці ехаць у замежжа. І дату 8 верасня лягчэй закласці ў падсвядомасць вучняў у школе тым, што можна будзе павіншаваць хлопчыкаў — будучых абаронцаў Айчыны. Напрыклад, у гэтым годзе 8 верасня я прыйшоў у школу і запытаўся ў дзяцей, што сёння за дзень. І адразу ж ім і расказаў, што і як. А калі я буду ім казаць, што нешта адбылося 15 ліпеня, то самі дзеці 15 ліпеня пра гэта дакладна не ўспомняць.

Вось такія мае асабістыя развагі наконт таго, калі нам святкаваць наш дзень беларускай вайсковай славы. Я цалкам згодны з аўтарам, што мы павінны абапірацца толькі на сваю гісторыю (дзякуй Богу, ёсць на што). Але хацелася б пры гэтым, каб падыход да нашай гісторыі быў больш дакладным і разважлівым.

**Вадзім ШЫШКО.**

# Каб узяць у шлюб, трэба пацвердзіць, што ў шлюбе дагэтуль не быў

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**Сын жыхаркі адной з вёсак Чэрвеньскага раёна сабраўся ўзяць шлюб са сваёй выбранніцай. Як і належыць, маладыя людзі падалі адпаведную заяву ў ЗАГС. А там з дзяўчыны запатрабавалі даведку, што раней яна... не была ў шлюбе.**

**— Сутнасць у тым, што мая будучая нявестка раней пражывала ў Ташкенце. Аднак вось ужо гадоў пяць-шэсць яна мае пасведчанне на права жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь. Да нядаўняга часу была прапісаная ў адным з раёнаў Брэсцкай вобласці. Даведку пра тое, што яна пражывала на тэрыторыі таго раёна з 2005 года і да нядаўняга часу, а таксама, што не брала шлюбу, яна атрымала без праблем.**

**А вось як быць з больш раннім часам? У ЗАГСе ў Чэрвені падказалі, што трэба ехаць або ў Маскву, або ў Кіеў у пасольства Узбекістана і праз яго рабіць адпаведны запыт на колішняе месца жыхарства. Зразумела, што такая паездка будзе каштаваць не танна, ды і часу патрабуе. Ці ёсць яшчэ якія варыянты вырашэння нашай сітуацыі? Яшчэ хачу дадаць, што маёй будучай нявестцы толькі ў красавіку споўнілася 19 гадоў, адпаведна, з Ташкента яна выехала фактычна дзіцем. Які там мог быць шлюб? Цяпер сын з будучай нявесткай жывуць у Мінску, — даводзіла нам сутнасць свайго звароту заяўніца.**

Можна было б пажартаваць, што ў Сярэдняй Азіі дзяўчат могуць аддаць у замуства ў раннім узросце, аднак тут відавочна, што людзям не да смеху. У пошуках патрэбнай заяўнікам інфармацыі нам давялося звярнуцца ў дэпартамент па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства юстыцыі, галоўнае ўпраўленне юстыцыі Мінаблвыканкама, паколькі сітуацыю ўскладняла тое, што выбранніца сына заяўніцы — грамадзянка Рэспублікі Узбекістан.

— Для рэгістрацыі шлюбу грамадзяне падаюць дакументы, названыя ў пункце 131 Пераліку адміністрацыйных працэдур, што ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі па заявах грамадзян, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 152 ад 16 сакавіка 2006 года, — паведаміла нам, у прыватнасці, **галоўны спецыяліст аддзела натарыята, ЗАГСаў і адвакатуры галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінаблвыканкама Алена СЕМЯНЮК**. — Гэта дакументы, што сведчаць асобу грамадзян Рэспублікі Беларусь, — пашпарт; для замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства, што пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, — пасведчанне на права жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь; дакумент аб адсутнасці зарэгістраванага шлюбу з іншай асобай, выдадзены кампетэнтным органам краіны пражывання замежнага грамадзяніна, асобы без грамадзянства (тэрмін дзеяння такога дакумента — 6 месяцаў); дакумент аб адсутнасці зарэгістраванага шлюбу з іншай асобай, выдадзены кампетэнтным органам дзяржавы, грамадзянінам якой з'яўляецца замежны грамадзянін, — у выпадку, калі замежны грамадзянін не пражывае на тэрыторыі дзяржавы, грамадзянінам якой ён з'яўляецца (тэрмін дзеяння і гэтага дакумента — 6 месяцаў); дакумент, што пацвярджае скасаванне папярэдняга шлюбу, калі раней грамадзянін у ім быў (за выключэннем дакументаў, выдадзеных органамі ЗАГС Рэспублікі Беларусь); дакументы, што сведчаць асобу аднаго з бацькоў асобы, што бярэ шлюб, — у выпадку рэгістрацыі шлюбу па месцы жыхарства аднаго з бацькоў.

Як бачна, неабходныя для рэгістрацыі шлюбу дакументы былі запатрабаваныя цалкам законна. Дарэчы, аналагічны парадак, як удакладнілі ў Міністэрстве юстыцыі, існуе ў любой краіне свету. Чым у такой сітуацыі можна было б дапамагчы заяўнікам? Як сказала Алена Семянюк, даведку з месца жыхарства дзяўчыны ў Беларусі аб адсутнасці зарэгістраванага шлюбу можна было б атрымаць і без выезду «на месца» — адзін беларускі ЗАГС мае права запатрабаваць такі дакумент ад другога беларускага ЗАГСа ў дачыненні да замежнага грамадзяніна, што пастаянна пражывае на тэрыторыі нашай краіны. Але, паўторымся, толькі ў межах нашай краіны. Аднак такі дакумент у заяўнікаў ужо ёсць, праблема — з аналагічным «ташкенцкім». Тут грамадзянін павінен дзейнічаць самастойна. А ці магчымы нейкі афіцыйны запыт з боку беларускіх дзяржорганаў? Як паведамілі нам у некалькіх крыніцах інфармацыі, па-першае, ён можа ўвогуле застацца без адказу з боку адрасата, або быць атрыманым праз значны тэрмін; па-другое, у некаторых замежных краінах за атрыманне такой даведкі менавіта грамадзяне мусяць заплаціць пэўную суму грошай. І ўсё ж адчайвацца людзям не варта. Для пачатку трэба нашым заяўнікам хоць бы звязацца з самім пасольствам Рэспублікі Узбекістан — або ў Маскве, або ў Кіеве. Можа, дазволяць накіраваць запыт па факсе ці поштай? Калі ўсё ж давядзецца ехаць, як мы даведаліся, лепш скіраваць шлях у бок Кіева — у Маскве з-за большага наплыву людзей атрымаць патрэбныя дакументы бывае часам некалькі складаней.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «Трэба прывыкаць, што і беларускія яблыкі могуць мець прыгожы выгляд»

**Наш даўні і шчыры прыхільнік мінчанін Пётр Андрэевіч Навуменкаў нядаўна пачуў інфармацыю пра закладку на міжсезонны перыяд бульбы, буракоў, морквы і іншай вітамінная прадукцыі. Апроч іншага яго зацікавіла паведамленне пра закладку на захоўванне беларускіх яблыкаў у газавым асяроддзі. «Што гэта за метад такі?» І, карыстаючыся выпадкам, працягнуў, як кажуць, тэму, якая ў апошнія гады з падачы розных заяўнікаў перманентна ўзнікала прынамсі на старонках нашай газеты.**

— У папярэднія гады зімой у крамах не заўсёды магчыма было купіць айчынныя яблыкі. Даводзілася браць на Камароўскім рынку. Прадаўцы хоць і сцвярджалі, што гэта беларускія плады, але я, маючы крыху досведу ў яблыках, не надта ім верыў. Дык у мяне такое пытанне-прапанова: а чаму б не адчыніць у Мінску адно-два спецыялізаваныя гандлёвыя прадпрыемствы, дзе пакупнік гарантавана мог бы набыць у тым ліку і беларускія яблыкі па прымальных цэнах і добрай якасці? Нешта накшталт крамаў «Беларуская садавіна і агародніна». Ёсць жа ў горадзе спецыялізаваныя крамы, скажам, па продажы рыбы і рыбнай прадукцыі, ці месцы, дзе заўсёды можна купіць свежы хлеб пэўных гатункаў. Яны карыстаюцца папулярнасцю. Чаму б не быць і «вітамінным» гандлёвым прадпрыемствам? — даводзіў сваю думку Пётр Андрэевіч.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Раней сапраўды былі агароднінныя і плодаагароднінныя крамы, але ад практыкі іх існавання было вырашана адысці. Няўжо чалавек праз увесь горад паедзе ў такое гандлёвае прадпрыемства толькі па яблыкі? Сёння большасць жыхароў хочуць мець поўны асартымент харчовых тавараў у краме, што месціцца бліжэй да дома, — адказаў на запыт чытача **начальнік аддзела нарыхтовак і знешнеэканамічнай дзейнасці Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Вячаслаў БАХАНОВІЧ**. — Цяпер плодаагароднінныя секцыі ёсць у кожнай харчовай краме, згодна з асартыментным пералікам там абавязкова павінны прадавацца і беларускія яблыкі. Праведзеныя намі маніторынгі наконт выканання гэтага патрабавання засведчылі, што парушэнняў тут практычна няма. Калі прыгадаць згаданую вашым чытачом Камароўку, чаму ён вырашыў, што набываў імпартныя плады? Цалкам не выключаю, што гэта маглі быць якраз беларускія яблыкі. Трэба прывыкаць, што прыгожымі могуць быць і яны.

Такім «пераўтварэнням» якраз і дапамагае захоўванне пладоў у газавым асяроддзі, пра што і пытаўся спадар Навуменкаў. Метад гэты сапраўды новы для нас, толькі летась апрабаваны ўпершыню. Спецыяльныя камеры былі ўсталяваныя на Мінскім аптовым рынку. У спецыяльнай сумесі газаў у пладоў замаруджваюцца працэсы гнілі, яны захоўваюць свае смакавыя якасці і знешні выгляд даволі доўга.

— Дзякуючы такім камерам мы гандлявалі яблыкамі мінулага ўраджаю да сёлетняга чэрвеня. Прычым на пачатку лета плады выглядалі так жа, як і пры закладцы на захоўванне ўвосень мінулага года, — патлумачыў далей Вячаслаў Алегавіч. — Бралі іх і для продажу на Камароўскім рынку. А да з'яўлення спецыяльных камераў захоўвання яблыкі заканчваліся раней.

Напрыканцы суразмоўца дадаў, што на сёлетні міжсезонны перыяд двума аптова-рознічнымі прадпрыемствамі — УП «Партызанскае» і Мінскі аптовы рынак — закладзена ў стабілізацыйны фонд 4223 тоны яблыкаў. Гэта на 200 тон больш, чым было закладзена на захоўванне летась.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**г. ВИТЕБСК** **15.12.2009**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Неиспользуемые объекты военного городка № 102, расположенные по адресу: г. Витебск, ул. Базовая, 12Б, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика капитальных строений: - капитальное строение с инв. № 200/С-49369 – склад общего назначения с рампой и техподпольем, одноэтажное кирпичное здание общей площадью 1670,3 кв.м., 1970 года постройки, фундамент бетонный, перекрытия железобетонные, крыша рулонная; - капитальное строение с инв. № 200/С-49367 – тарный склад, одноэтажное кирпичное здание общей площадью 265,3 кв.м, 1982 года постройки, фундамент бетонный, перекрытия железобетонные, крыша рулонная; - капитальное строение с инв. № 200/С-49364 – свинарник с навесом и складом, одноэтажное кирпичное здание общей площадью 382 кв.м, 1993 года постройки, фундамент бетонный, перекрытия железобетонные, крыша рулонная; - капитальное строение с инв. № 200/С-49362 – склад с двумя навесами, одноэтажное кирпичное здание общей площадью 198 кв.м, 1970 года постройки, фундамент бетонный, перекрытия железобетонные, крыша рулонная; - капитальное строение с инв. № 200/С-49363 – тарный склад, одноэтажное кирпичное здание общей площадью 189,6 кв.м, 1982 года постройки, фундамент бетонный, перекрытия железобетонные, крыша рулонная; - капитальное строение с инв. № 200/С-57665 – сооружение специализированное энергетики (электрическая сеть) протяженностью 516,3 кв.м; - покрытие асфальтобетонное площадью 5887 кв.м с бордюрным камнем 69 кв.м; - ограждение железобетонное с воротами протяженностью 121 м. Земельный участок: с кадастровым номером 240100000002002702 площадью 1,9478 га для содержания и обслуживания строений, срок аренды – 30 лет | 1240974236 | 124097423 |
| 2. | Здание склада с рампой, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Боровая, д. 11, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 250/С-27777 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), одноэтажное кирпичное, 1985 г. постройки, фундамент бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша рулонная, общая площадь 1030 кв.м, объем 5232 куб.м, бетонная рампа, площадь 95 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 243500000001001208 для содержания и обслуживания здания вещевого склада, площадь 0,4656 га, срок аренды – 25 лет. Использование – под специализированное здание здравоохранения и предоставления социальных услуг | 302057796 | 30205779 |
| 3. | Здание трансформаторной подстанции, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Карла Маркса, в районе дома № 32, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика капитального строения: капитальное строение с инв. № 200/С-57715 – здание специализированное энергетики, трансформаторная подстанция № 4-с, общей площадью 66,0 кв.м., одноэтажное кирпичное, 1939 года постройки, фундамент бетонный, перекрытие железобетонное, крыша рулонная. Земельный участок с кадастровым номером 240100000002003011 площадью 0,0122 га, для содержания и обслуживания трансформаторной подстанции, сроком аренды 99 лет. Ограничения в использовании в связи с нахождением участка в охранной зоне магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных сооружений (ливневая канализация), водопровода, охранных зонах линии электропередач напряжением свыше 1000 В, теплотрассы | 22832892 | 2283289 |
| НАЧАЛЬНЫЕ ЦЕНЫ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНЫ НА 20 % | | | | |
| 4. | Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11334, расположенное по адресу: Витебская область, Городокский район, г. Городок, ул. Вокзальная, 40а, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11334 – здание специализированное розничной торговли (магазин) – одноэтажное кирпичное здание 1974 г. постройки, общей площадью 457,2 кв.м, фундамент бетонный, перекрытия ж/б плиты; крыша рулонная, с кирпичным тамбуром, двумя кирпичными сходами в подвал, железобетонным подвалом и асфальтобетонным покрытием. Земельный участок: площадью 0,0625 га, сроком аренды 99 лет, кадастровый номер 221850100001003220, для размещения объектов розничной торговли. Ограничение в использовании всего участка в связи с нахождением в водоохранной зоне реки, а также охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади – 0,0026 га | 68135224 | 6813522 |
| 5. | Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11373, расположенное по адресу: Витебская область, Городокский район, г. Городок, ул. Вокзальная, д. 53, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11373 – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг (здание фельдшерско-акушерского пункта) – одноэтажное бревенчатое здание 1949 г. постройки, общей площадью 105,4 кв. м, фундамент бутобетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная, с двумя холодными кирпичными пристройками, дощатым сараем, забором деревянным, двумя калитками, уборной. Земельный участок: площадью 0,1126 га, кадастровый номер 221850100001003221, срок аренды участка – 99 лет, для размещения объектов здравоохранения и предоставления социальных услуг. Охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади 0,0204 га | 37089871 | 3708987 |

**ОРГАНИЗАТОР: фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail: fondvitebsk@tut.by.**

1. **Аукцион состоится 15 декабря 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 14.12.2009 г. до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 15.12.2009 с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. **Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.**

4. **Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; **не позднее 10 рабочих дней** со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения райисполкомом), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 3 миллиона рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; **не позднее 12 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

5. Подробная информация об условиях аукционов, порядке участия и проведения аукционов опубликована ранее в газете «Звязда» от 02.09.2009 № 164 (26522), от 10.10.2009 № 192 (26550), от 14.10.2009 № 194 (26552).

# УСЁ ПЕРАМЕЛЕЦЦА...



**Водгукі на артыкулы, прысвечаныя 600-годдзю Грунвальдскай бітвы, сведчаць, што чытачы «Звязды» зацікаўленыя ў тым, каб гэтая падзея адзначалася ў нас шырока. Разам з гэтым яны занепакоены, што часу для ўсталявання помніка ў гонар гэтай Перамогі застаецца ўсё менш.**

*— Вельмі добра, што «Звязда» ў чарговы раз выступіла ў абарону нашай спадчыны і гісторыі, але я зразумеў, што раённыя ўлады да помніка не праяўляюць цікавасці. І што будзе далей? — пытаецца* ***Віктар СВІГЛА з Косава Івацэвіцкага раёна****.*

**Леанід ПАТАПЧУК з Пружан** таксама настроены песімістычна:

— Даводзілася бачыць, як іншым разам праводзіцца перазахаванне салдатаў, якія загінулі ў мінулую вайну. Правялі мерапрыемства, паставілі «птушачку»... а мы тут нейкі Грунвальд успомнілі. Хоць я вось разгарнуў кніжку і чытаю пра тыя падзеі.

Найбольшая наша бяда ў тым, што калі заходзіць размова пра Грунвальдскую бітву, твае суразмоўцы не разумеюць, пра што ідзе гаворка. «Так-так, тады рускіх моцна пабілі», — бярэ ініцыятыву ў свае рукі мясцовы начальнік, а другі, пазіраючы на праект помніка, пачынае разважаць, што такі манумент быў бы дастойным помнікам і перамогі над фашызмам. А пачуўшы, што Тэўтонскі ордэн ад гітлераўскай Германіі аддзяляе паўтысячы гадоў, не здаецца: «Там і там немцы, то можна было б гэтыя перамогі ўвекавечыць у адным помніку».

І няма нічога дзіўнага ў такіх разважаннях. У іншым райцэнтры не адзін помнік воінам Вялікай Айчыннай — на ўездзе штыкі ў бетоне, на плошчы, у цэнтры, манумент воіна з аўтаматам, а на выездзе — курган Славы. Помнікі знаёмыя і зразумелыя, каля іх і прамову складную сказаць можна. А Грунвальд — гэта нібы Марс: чужая і далёкая планета.

*— А хто нам пра перамогу пад Грунвальдам гаварыў,* — разважае **мінчанін В. НАВІЦКІ**, *— што мы пра яго ведаем. Ды што Грунвальд! Кожны раз, калі я бачу помнік Калініну, то сам у сябе пытаюся: «За якія заслугі яму ў Мінску паставілі такі манумент?» Прачытаў, што ён прыязджаў у Беларусь і выступаў на мітынгу, дапамагаў тагачасным партыйцам праводзіць калектывізацыю... Але «ўсесаюзны староста» нават у той партыйнай іерархіі быў асобай непрыкметнай — шараговай. А мы шукаем месца, дзе паставіць помнік Перамогі пад Грунвальдам...*

Асобна хачу спыніцца на лісце, які даслаў **Уладзімір ДЗЕМЧАНКА з в. Машканы Сенненскага раёна**. У аўтара свая думка наконт тых далёкіх падзей. *«Дык вось Грунвальдская бітва і яе вынік паспрыялі развіццю сітуацыі, якая аказалася неспрыяльнай, вельмі трагічнай для ВКЛ і яго народаў»,* — піша наш чытач. Ён мяркуе, што Вялікаму Княству неабходна было аб'ядноўвацца з Маскоўскай дзяржавай і тады ў Вялікага Княства была б «лепшая палітычная перспектыва».

Аб'яднанне з Масковіяй было немагчыма па адной даволі сур'ёзнай прычыне. Вялікае Княства ў той час было еўрапейскай дзяржавай, а маскоўская дзяржава знаходзілася на задворках Еўропы, і толькі Пётр I здолеў вырваць яе з затхлай правінцыяльнасці.

А па вялікім рахунку, Вялікае Княства знаходзілася паміж «молатам і кавадлам», і саюз з маскоўскай дзяржавай прынёс бы Вялікаму Княству не меншыя беды.

Адносна вынікаў будучай Перамогі пад Грунвальдам, то перад бітвай ніхто іх не падсумоўваў — неабходна было перамагчы. А калі б верх узялі крыжакі, то якія наступствы былі б?!

Уладзімір Дземчанка лічыць, што *«ўсталяванне такога помніка-манумента адносіцца да кампетэнцыі дзяржаўных уладаў, а вы хочаце зрабіць гэта на ўзроўні раёна»* ...і нават, каб *«у пэўных раёнах усталяваць знакі памяці ўдзельнікам гэтай бітвы (як прапануе Іван Пячынскі), але і гэтае пажаданне таксама спантанна не вырашыцца — трэба дырэктыва»*.

Ужо не адзін месяц «Звязда» ўздымае тэму ўсталявання помніка ў гонар 600-годдзя Грунвальдскай бітвы, і заявіць, што гэта робіцца спантанна, нельга. Акрамя гэтага, ёсць праект-ідэя помніка. Мае ён мастацкую каштоўнасць ці не — гэта асобная размова, але крок зроблены. Ісці шляхам дырэктывы можна — ён самы просты, але ў мастацтве неэфектыўны.

А ці не за лепшае было б, каб, напрыклад, мясцовыя Саветы прынялі рашэнне аб усталяванні помніка, а дэпутаты райсавета яго падтрымалі... Чаму ініцыятыва не можа зыходзіць знізу? Думаю, што такі падыход самы дэмакратычны, але ці спрацуе ён, ёсць сумненне. Узяць ініцыятыву і адказнасць на сябе мы баімся, ды і не хочам, а вось калі будзе дырэктыва зверху, то «казка стане быллю».

Трэба ўлічваць і той фактар, што публікацыі ў нашай газеце дапамагаюць чытачам шырэй глянуць на нашу гісторыю і адчуць сваё дачыненне да Перамогі пад Грунвальдам. А гэта, бадай, самае важнае.

*— 600-я ўгодкі Грунвальдскай бітвы павінны адзначацца на дзяржаўным узроўні,* — разважае **Вячаслаў КУЛЮТА з Гродна**, *— а калі справа дойдзе да помніка, то яго неабходна паставіць на адным з пагоркаў пры дарозе Навагрудак — Мір, дзе праязджае многа турыстаў, і помнік будзе напамінаць ім пра слаўны перыяд нашай гісторыі. У любым выпадку помнік пажадана паставіць не ў глыбокай правінцыі, а на тэрыторыі нашага «залатога кола»*.

«І што будзе далей?» — пытаецца наш чытач у пачатку гэтага артыкула.

Усё перамелецца... Даволі аптымістычная народная прымаўка.

Усё будзе добра! Спадзяёмся на гэта.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

